# ВЯЛІКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ МАЛЕНЬКАГА ПРАФЕСАРА

## традыцыйная культура і побыт беларусаў





























# ВЯЛІКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ МАЛЕНЬКАГА ПРАФЕСАРА

## традыцыйная культура і побыт беларусаў



Мінск
«Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі»
2021

УДК 087.5:908(476)
ББК 26.89(4Беи)
Т65

Серыя заснавана ў 2016 годзе

Аўтары тэксту: К.С. Півавар, Г.А. Арцямёнак

Для малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту

Т65 **Традыцыйная культура і побыт беларусаў** : для мал. і сярэд. шк. узросту / аўт. тэксту К.С. Півавар, Г.А. Арцямёнак — Мінск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2021. — 180 с. : іл. — (Вялікая энцыклапедыя маленькага прафесара).

ISBN 978-985-11-1304-6.

Выданне знаёміць чытачоў з традыцыйнай культурай і побытам беларусаў. У кнізе сабраны паняцці, блізкія і зразумелыя кожнаму жыхару нашай краіны. Амаль у кожным артыкуле аўтары падаюць варыянты выкарыстання слова, гісторыю яго паходжання, прыводзяць прыказкі і прымаўкі, у якіх яно ўжываецца. Такі падыход паспрыяе пашырэнню актыўнага слоўніка школьніка, дапаможа лепш усвядоміць сэнс асобных слоў і выразаў.

Выданне будзе карысным для самастойнага і сямейнага чытання, для падрыхтоўкі дамашняй работы, паведамленняў па розных тэмах, на ўроках і на пазакласных занятках.

**УДК 087.5:908(476)**
**ББК 26.89(4Беи)**

**ISBN 978-985-11-1304-6**

© Півавар К.С., Арцямёнак Г.А., тэкст, 2021
© Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі», 2021



# ПРАДМОВА

У мове кожнага народа ёсць словы, якія адносяцца менавіта да яго жыцця і культуры. Напрыклад, карыда (бой быкоў) — для апісання іспанскай культуры, бусідо (кодэкс самурая) — японскай, ланч (прыём ежы апоўдні) — англійскай. Такія словы, як правіла, не маюць адпаведніка ў іншых мовах свету і ўтрымліваюць важную інфармацыю аб жыцці народа.

У мовазнаўстве гэтыя словы маюць адмысловую назву — лінгвакультурэмы, або лінгвакраіназнаўчая лексіка.

Ёсць падобныя словы і ў беларускай мове. Яны сабраны ў кнізе, якую вы трымаеце ў руках. Асаблівасці традыцыйнага жыцця беларусаў, іх гаспадарчай і культурнай дзейнасці як у люстэрку адбіліся ў беларускай мове, прымаўках і прыказках, вуснай народнай творчасці, творах пісьменнікаў. Гэта кніга праз беларускія словы і іх азначэнні распавядае пра тое, як жылі нашы продкі некалькі стагоддзяў таму, як яны ставіліся да прыроды і сусвету, як вялі гаспадарку, якімі былі іх уяўленні пра

навакольны свет. Вы даведаецеся таксама пра традыцыйныя святы беларусаў, пра тое, як яны святкаваліся ў далёкія язычніцкія часы і як змяніліся з прыняццем хрысціянства, і пра тое, як гэтыя старадаўнія традыцыі знайшлі адлюстраванне ў цяперашнім жыцці, якое сучаснае гучанне яны набылі.

Праз мову лягчэй зразумець традыцыі, характар і памкненні беларусаў, адказаць на пытанне, што было важным для нашых продкаў і значным у паўсядзённым жыцці, і такім чынам паглыбіць свае веды пра родную краіну і яе народ.

# ТРАДЫЦЫЙНЫ ПОБЫТ БЕЛАРУСАЎ

# ПАСЕЛІШЧЫ І ПАБУДОВЫ

## ВЁСКА

**Паселішча сельскага тыпу з некалькімі дзясяткамі альбо сотнямі хат індывідуальнага збудавання.**

Вёскі ўзнікалі з сукупнасці асобных двароў і мелі даволі невялікія памеры. З цягам часу яны маглі пераўтварацца ў сёлы. У вёсцы, як правіла, у адрозненне ад сяла не было царквы.

Вёсцы быў уласцівы ўклад жыцця, звязаны з сельскагаспадарчай вытворчасцю і народнай традыцыйна-побытавай культурай. На працягу многіх стагоддзяў вёска была захавальніцай самабытных народных традыцый.

Сёння ў Мінскім раёне каля вёскі Азярцо дзейнічае Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту, які створаны для захавання і дэманстрацыі традыцыйнага драўлянага дойлідства, прадметаў побыту, папулярызацыі народнай культуры і традыцый.

У аснове экспазіцыйнай зоны — умоўны падзел тэрыторыі Беларусі на шэсць гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў: Цэнтральная Беларусь,



Падняпроўе, Паазер'е, Усходняе і Заходняе Палессе, Панямонне. Кожны з гэтых рэгіёнаў мае своеасаблівы тып вясковай забудовы.



Жыццю вёскі прысвечаны розныя газеты і часопісы. Часопіс «Саха» выдаваўся ў пачатку XX стагоддзя. На яго старонках апавядалася пра новыя метады апрацоўкі зямлі, палепшаныя гатункі насення, шматпольную сістэму севазвароту. Часопіс арыентаваў на спецыялізацыю гаспадаркі, развіццё жывёлагадоўлі, пісаў пра садоўніцтва, агародніцтва, у ім даваліся гаспадарчыя парады. Больш чым 90 гадоў існуе «Сельская газета», якая ў свой час выходзіла пад рознымі назвамі: «Беларуская вёска», «Калгаснік Беларусі», «Савецкі селянін», «Калгасная праўда», «Сельская газета», «Белорусская нива».





САХА

ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ МЕСЯЧНІК СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ.

На выстаўцэ насеньня у Вільні у лютым 1913 г. „Саха“ за стацьці аб насеньнях дастала

СРЭБНУЮ МЭДАЛЬ.

[illegible]

Цэна асобнаго нумэру 8 кап., з дастаўкай да хаты 10 кап.

# ГАРАДЗІ́ШЧА

**Месца, дзе захаваліся рэшткі старажытнага пасялення. Найчасцей трохвугольная, прамавугольная ці круглая пляцоўка, зробленая з выкарыстаннем прыродных умацаванняў (рака, іншы вадаём, роў).**

Часта гарадзішчы маюць мясцовыя назвы, напрыклад: Гарадзішча, Гарадок, Замкавая гара, Замэчак. Як і іншыя помнікі археалогіі, гарадзішчы ахоўваюцца дзяржавай, каля іх звычайна ўстаноўлены ахоўны знак.

Гарадзішча — распаўсюджаная назва вёсак (каля 30 вёсак у Беларусі







маюць такую назву). На тэрыторыі некаторых гарадзішчаў дзейнічаюць музеі-павільёны з раскапанымі рэшткамі старадаўніх пабудоў (археалагічны музей «Бярэсце» ў горадзе Брэсце, гісторыка-археалагічны комплекс «Старажытны Тураў» у горадзе Тураве Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці і іншыя).



# ГАСЦІ́НЕЦ

**Вялікая бойкая дарога; тракт.**

Гасцінцы з'яўляліся асноўнымі гандлёвымі шляхамі, былі галоўнымі магістралямі, злучалі вялікія гарады і суседнія землі. Звычайна гасцінец з абодвух бакоў абсаджвалі дрэвамі. Будаваліся яны для руху коннага транспарту, часам уздоўж іх былі размешчаны кузні, корчмы. Некаторыя гасцінцы мелі свае ўласныя назвы: напрыклад Вітаўтава дарога, якая існавала ў XIV—XVII стагоддзях на памежжы Валыні і Палесся. Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 года замацоўваў памеры гасцінца і рэгламентаваў парадак руху па ім.

Сёння слова «гасцінец» актыўна выкарыстоўваецца ў назвах фальклорных ансамбляў, тэлеперадач, кафэ, харчовай прадукцыі, аграсядзіб і іншага.

Словам «гасцінец» таксама называюць падарунак.





**ДАРО́ГА**, шлях, бальшак, прасёлак, пуцявіна

**Паласа зямлі, прызначаная для язды і хадзьбы, якая злучае асобныя пункты мясцовасці; адлегласць, якую трэба праехаць або прайсці.**

Слова «дарога» выкарыстоўваецца таксама ў значэнні ‘жыццё, жыццёвая дарога, жыццёвы шлях’, як, напрыклад, у назвах кнігі ўспамінаў «Доўгая дарога дадому» Васіля Быкава.

У народнай медыцыне перакрыжаванне дарог лічылася магічным месцам, на якім можна пазбавіцца ад хвароб пры выкананні асаблівых рытуальных дзеянняў.

# ЗА́МЧЫШЧА

**Месца, дзе некалі знаходзіўся замак (слова не мае адпаведніка ў рускай мове).**

Старажытныя беларускія гарады амаль заўсёды забудоўваліся каля вялікіх замкаў, якія мелі важнае абарончае значэнне. Замчышчы захаваліся ў Мінску, Тураве, Дуброўне, Дзяржынску, Заслаўі, Ваўкавыску, Глуску, Крычаве, Рагачове, Лепелі, Гарадку, Слуцку і іншых гарадах.



# КІРМА́Ш



**Святочна абстаўлены пашыраны гандаль, які праводзіцца ў пэўную пару года ў пэўнай мясцовасці; у пераносным значэнні — шумнае, ажыўленае зборышча людзей.**

Прымяркоўваўся кірмаш да пэўнага царкоўнага свята. Адсюль і назвы — Троіцкі, Ільінскі, Спасаўскі, Пакроўскі і іншыя. У XVII — пачатку XIX стагоддзя найбуйнейшыя кірмашы адбываліся ў Зэльве, Свіслачы (Гродзенская вобласць), Нясвіжы (Мінская вобласць), Любавічах (цяпер Смаленская вобласць, Расія), Гомелі, Бешанковічах (Віцебская вобласць). Значнымі кірмашовымі цэнтрамі былі Мінск, Ігумен (цяпер горад Чэрвень Мінскай





вобласці), Навагрудак, Мір (Гродзенская вобласць), Брэст, Кобрын, Пінск (Брэсцкая вобласць).

Апрача вырабаў мясцовай прамысловасці і сельскай гаспадаркі на беларускія кірмашы дастаўлялася шмат тавараў з суседніх абласцей і з-за мяжы. Яны адрозніваліся паміж сабой спецыялізацыяй гандлю: на адных гандлявалі ў асноўным сельскагаспадарчымі таварамі і прадметамі дробных промыслаў, на іншых — пераважна жывёлай (так званыя скотныя, ці конныя, кірмашы), на трэціх — прамысловымі таварамі і прадметамі раскошы.

Слова замацавалася ў беларускіх прыказках і прымаўках: «Каму кірмаш, а каму жыцця нямаш», «Хваляцца з кірмашу едучы».



# МЯСТЭ́ЧКА

**Населены пункт, які займаў прамежкавае становішча паміж горадам і вёскай.**

Назва ўтварылася як памяншальная форма ад слова «места», што азначае ‘гарадок, маленькі горад’. Мястэчка мела меншую за горад колькасць насельніцтва, але ў адрозненне ад вёскі вылучалася развітым гандлем, рамёствамі, мела вялікую культурную і гістарычную значнасць. У пачатку XX стагоддзя на Беларусі налічвалася больш за 300 мястэчак, але размяшчаліся яны нераўнамерна: большасць прыпадала на заходнія землі. Некаторыя з іх прыходзілі ў заняпад і ператвараліся ў вёскі, іншыя раслі і атрымлівалі статус гарадоў.

Беларускія мястэчкі сталі аб’ектам даследаванняў многіх гісторыкаў. Даследчыца Іна Соркіна сцвярджае: «Важнае гістарычнае значэнне мястэчак заключаецца ў тым, што яны з’яўляліся прыкладам «сужыцця» ў згодзе пад «адным дахам» розных этнасаў, вераў, моў і культур».

Утвораныя ад назоўніка словы «местачковец» — той, хто жыве ў мястэчку, «местачковы» — той, хто мае адносіны да мястэчка.

Выраз «местачковы розум» можа выкарыстоўвацца ў негатыўным значэнні ‘абмежаваны, малаадукаваны’.



# РА́ТУША



**Будынак, дзе размяшчаліся органы самакіравання.**

Слова паходзіць ад нямецкага «Rathaus» — дом сходаў. На тэрыторыі Беларусі ратушы пачалі будаваць з XIV стагоддзя, што звязана з атрыманнем беларускімі гарадамі магдэбургскага права. Узводзіліся ў гарадах на гандлёвых плошчах, дзе адбываліся кірмашы, часам маглі аб'ядноўвацца з гандлёвымі радамі. Будаваліся з дрэва або цэглы, з-за частых пажараў у сярэдневяковых гарадах часта перабудоўваліся. У XVII—XVIII стагоддзях пераважаў барочны тып ратуш, часта са шмат'яруснай вежай, завершанай разнастайнымі купалкамі ці шпілем. Вежа выконвала ролю назіраль-








най вышкі (у выпадку пажару альбо ваеннага нападу). Ратушы ў стылі класіцызму вылучаліся манументальнасцю і цэльнасцю. Існавалі ратушы з рысамі несапраўднай готыкі, віленскага барока.

Галоўным памяшканнем ратушы была парадная зала (звычайна на другім паверсе) для ўрачыстых актаў, пасяджэнняў магістрата, тэатральных паказаў і іншых мерапрыемстваў. Частка памяшканняў ратушы (падвалы, першыя паверхі) адводзілася пад крамы, склады. Ратуша арганічна ўваходзіць у гістарычныя цэнтры сучаснага гарадскога асяроддзя, у большасці беларусіх гарадоў у іх размешчаны музеі. Першапачаткова пабудаваныя ратушы захаваліся ў Шклове, Чачэрску, Слоніме, Нясвіжы, Віцебску (з элементамі перабудовы), адноўленыя — у Мінску і Магілёве. У 2020 годзе Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь выпусціў памятную манету з выявай Чачэрскай ратушы.

# ХА́ТА



**Жылая сялянская пабудова, зрубленая з бярвення; асобны сялянскі двор, гаспадарка; асобная сям’я.**

На тэрыторыі Беларусі быў распаўсюджаны дом зрубавай канструкцыі з адным пакоем. З цягам часу планіроўка хаты ўскладнілася: узнікла двух- і трохпакаёвае жытло. Для будаўніцтва хаты часцей выкарыстоўвалі хвою і елку, дах пакрывалі саломай, чаротам, дранкай, гонтай, чарапіцай.

Часткі інтэр’ера маюць сімвалічнае значэнне — печ, парог, покуць (самае пачэснае месца ў хаце, дзе стаялі абразы), падлога, якая ўяўлялася як зямля (глеба); на вяселле, напрыклад, была традыцыя пасыпаць яе зернем. Лічылася, што праз вокны хаты могуць завітаць душы памерлых продкаў, таму на Дзяды рытуальны пачастунак ставілі на падаконнік.






У беларускім фальклоры, прыказках і прымаўках хата ўяўляецца як вялікая каштоўнасць для чалавека: «Свая хатка як родная матка», «Няма лепшай хаткі, як у роднай маткі»; атаясамліваецца з сям’ёй і радзімай: «Не да Каляды, калі поўна хата бяды», «Лепш у сваёй хатцы, як у чужым палацы».



# ХУ́ТАР



**Адасоблены сялянскі зямельны ўчастак разам з сядзібай уладальніка; від сельскага населенага пункта невялікага памеру.**

Сялянскія хутары на тэрыторыі Беларусі з'явіліся ў другой палове XIX стагоддзя з развіццём капіталізму і пашырыліся ў гады правядзення Сталыпінскай аграрнай рэформы. Палітыка хутарызацыі — перасяленне сялян з вёсак на хутары — актыўна праводзілася ў 1920-я гады.

Пашырэнне аграэкатурызму ў краіне надало новы імпульс развіццю хутароў. Гаспадары аграсядзіб актыўна выкарыстоўваюць слова «хутар» у назвах («Хутар Дудара», «Вясёлы хутар»).

На хутарах адбываліся падзеі многіх твораў беларускай літаратуры (апавяданне «Літоўскі хутарок» Максіма Гарэцкага, паэма «Ягадны хутар» Яўгеніі Янішчыц, кніга «Крык на хутары» Георгія Марчука).



# ВАКОЛ ХАТЫ

## БУСЛЯ́НКА

**Гняздо бусла.**

У дыялектнай мове сустракаюцца назвы бусліна, бусленіца, буслаўка. Буслянка з'яўляецца неад'емным атрыбутам краявіду беларускай традыцыйнай вёскі. Здаўна лічылася, што калі на будынку ці на дрэве каля хаты бусел зробіць сабе гняздо, то гэтаму дому будзе шанцаваць. У вершы «Зямля бацькоў» Пімена Панчанкі ёсць радкі:

Пад навальнічны подых рэзкі
я пад буслянкаю стаю
і ў ціхай вёсачцы палескай
сябе малога пазнаю.



**ДАМАВІ́К**, Дамавы, Хатнік, Гаспадар, Падпечнік, Хоплік.

**У славянскіх народаў, у тым ліку ў беларусаў, — хатні дух, міфічны гаспадар і заступнік хаты, які забяспечвае здароўе людзей і жывёл, багаты ўраджай.**

У беларускай міфалогіі ён звычайна падобны на невялічкага чалавечка, старэнькага дзядка з сівой барадой, апранутага ў белую кашулю і падпяразанага лыкам. У народных казках дамавік жыў у хаце (за печчу ці пад печчу). Ён дапамагаў той гаспадарцы, дзе жыве дружная сям'я, дзе падтрымліваецца чысціня і парадак, пільнуюцца традыцыі і звычаі. Крыўду і помслівасць дамавіка выклікаюць сямейныя сваркі, брыдкаслоўе, неахайнасць у гаспадарцы. Жарты яго бяскрыўдныя. Калі добра сцямнее, дамавік пачынае сваволіць: стукаць у сцяну, ляскаць дзвярыма, тушыць агонь, сцягваць з сонных коўдру.

Асаблівую актыўнасць дамавік праяўляе ў дні шанавання продкаў, а таксама на Каляды і Купалле. Пакідаючы ежу дамавіку, абавязкова прыгаворвалі прыблізна так: «Гаспадар-бацюхна, захавай маю хацінку і маю скацінку», «Гаспадарушка, бацюхна, хлеб-соль прымі, скацінку вадзі». Пры пераездзе ў новую хату яго запрашалі з сабой: «Дамавік, дамавік, не заставайся тут, а ідзі з нашай сям'ёй».

У беларускай мове захаваліся прыказкі: «Без дамавіка хата трымацца не будзе», «Дамавік ад чорта адстаў, а да людзей не прыстаў».

Сёння слова «дамавік» выкарыстоўваецца ў назвах тавараў, напрыклад: «Шпаркі дамавік» — інтэрнэт-правайдар, «Дамавік» — абутковая касметыка.







# ДРЭ́ВА

**Шматгадовая расліна з цвёрдым ствалом і галінамі, якія ўтвараюць крону.**

У беларускай народнай культуры дрэва мае сімвалічнае значэнне. Яно можа выступаць як сродак далучэння да свету продкаў — Дрэва жыцця. Дрэва выступае як сімвал памяці пра мінулае, вобраз самой вечнасці. Асабліва цесная сувязь у чалавека з пладовымі дрэвамі. Сыравіна з дрэва называецца драўнінай. Драўлянае дойлідства — від мастацтва, пашыраны ў Беларусі.

У беларускіх прыказках і прымаўках дрэва нярэдка ўвасабляе чалавечыя якасці, напрыклад: «Ад крывога дрэва не бывае прамога ценю», «Скрыпучае дрэва жывучае», «Крывое дрэва ў сук не расце».

# ЖО́РНЫ

**Ручны каменны ці драўляны млын, пры дапамозе якога перацíралі зерне на муку.**

Каменныя жорны складаліся з двух каменных дыскаў, пастаўленых у скрынку ці станок. Драўляныя рабілі з дубовых калодак, на рабочую частку якіх набівалі кавалачкі чыгуну або жалеза. У сучаснай хатняй гаспадарцы амаль не выкарыстоўваюцца.

Вобраз жорнаў сустракаецца ў беларускай мастацкай літаратуры. Ужываецца выраз «жорны лёсу» як сінонім «перыпетыяў лёсу»; фразеалагізм «трапіць у жорны» абазначае ‘трапіць у складанае становішча’.

Узоры разнастайных жорнаў сустракаюцца амаль на ўсіх этнаграфічных выставах у беларускіх музеях. Слова выкарыстоўваецца ў назвах брэндаў, напрыклад: «ŽORNY. Штукарская пякарня і цукерня».



## КАЛО́ДЗЕЖ, Студня

**Збудаванне ў выглядзе вузкай глыбокай ямы, умацаванай ад абвалаў зрубам, трубамі для здабывання вады з ваданосных слаёў зямлі.**

Беларусы верылі, што калодзеж можа выконваць жаданні, вылечваць ад хваробаў. Многія беларускія казкі пачынаюцца з таго, што дачка (дзяўчына, падчарка) выпускае з рук рэч, спускаецца ў калодзеж шукаць яе і аказваецца ў іншым свеце. Пры будаўніцтве калодзежа ўлічваўся шэраг фактараў, і перш за ўсё «ўдалы час» (на маладзік – месяц, які расце).

У народнай культуры калодзежы і вада ў іх заўсёды надзяляліся святасцю: «Не плюй у калодзеж, бо прыйдзецца адтуль ваду піць». Нашы продкі лічылі, што воды рэк, азёр, калодзежаў у падземным свеце выцякаюць з адной крыніцы, таму нярэдка калодзежы станавіліся цэнтральным аб'ектам некаторых абрадаў, напрыклад выклікання дажджу. У беларускай мове існуе выраз «невычарпальны калодзеж», што азначае вялікую колькасць чаго-небудзь: «Нашы лясы — гэта нашых даброт і багацця невычарпальны калодзеж» (Мікола Гусоўскі. «Песня пра зубра»).





## ЛАЗНЯ

**Спецыяльнае памяшканне з печчу, дзе мыюцца і парацца; у пераносным, размоўным сэнсе — наганяй, праборка.**

Лазня будавалася звычайна без падмурка, першы вянок мог класціся на зямлю або на камяні па вуглах. Знізу зруб абсыпалі зямлёй. Столь рабілі з дошак або абчэсаных жэрдак і засыпалі зверху лісцем або кастрыцай, а вышэй пяском ці глінай. Падлога рабілася драўляная. Печ стаяла ля ўваходу і магла тапіцца «па-чорнаму» (калі ў печы не было дымахода), а ўздоўж сцен стаялі нізкія лавы. Лазні маглі мець таксама прылазнік (або прымыльнік), які не меў столі або падлогі, у ім стаялі некалькі лавак.

Па беларускіх павер'ях, у лазні жыве міфічная істота — лазнік.

Слова выкарыстоўваецца ў складзе фразеалагізмаў: справіць лазню — пакараць, зрабіць вымову; лазні дастаць — атрымаць наганяй, строгую вымову.

# МЛЫН

**Прадпрыемства, будынак з устаноўленымі ў ім прыстасаваннямі для размолу зерня.**

Беларусы шырока выкарыстоўвалі энергію ветру і вады, таму млыны былі характэрнай часткай беларускіх краявідаў.

Першыя млыны на тэрыторыі Беларусі былі вадзянымі. Першыя згадкі пра ветраныя млыны адносяцца да XVI стагоддзя. Для абазначэння ветранога млына выкарыстоўваецца слова «вятрак», якое не мае адпаведнікаў у іншых мовах.

На берагах рэк і азёр будавалі вадзяныя млыны. Узводзіліся яны з дрэва, найбольш актыўна ў XVI—XIX стагоддзях. Такія млыны шырока бытавалі да пачатку XX стагоддзя.





У цяперашні час будынкі млыноў выкарыстоўваюцца як музеі, установы культуры. Напрыклад, Аршанскі этнаграфічны музей «Млын», Дом рамёстваў «Стары млын» (горад Паставы Віцебскай вобласці), вятрак галандскага (ці шатровага) тыпу знаходзіцца ў музейным комплексе старажытных народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі», млын можна ўбачыць у стылізаванай беларускай этнаграфічнай вёсцы XIX стагоддзя каля горада Магілёва.

Слова «млын» выкарыстоўваецца ў назвах культурных мерапрыемстваў: «Чароўны млын» — выстава аўтарскіх прац у Мінску, «Млын моды» — фестываль-конкурс моды і фота, найбуйнейшы кірмаш майстроў краіны «Млын».

У вядомым беларускім традыцыйным танцы «Млынок» у жвавым тэмпе танцоры імітуюць вярчэнне млынавых жорнаў і работу млынара. Упершыню на сцэне ён быў выкананы ў пачатку XX стагоддзя першай беларускай тэатральнай трупай Ігната Буйніцкага.

У беларускай культуры млыны заўжды лічыліся месцамі таямнічымі і загадкавымі. Нярэдка млынароў лічылі ведзьмакамі, яны быццам прыносілі ахвяру вадзяніку, які жыў пад колам. Адсюль прыказка «Удзень мелюць млынары, а ўночы — чэрці».

Існуе выраз «ліць ваду на млын» (каго, чый) — ускосным чынам дапамагаць сваімі выказваннямі, справамі.

# У ХАЦЕ

## ГАСЦІ́ННАСЦЬ

**Жаданне, гатоўнасць прыняць гасцей і пачаставаць іх; ветлівасць, сардэчнасць у абыходжанні з гасцямі.**

Слова «госць» у даўніну азначала ‘чужынец, магчымы вораг’. Аднак паступова яно стала абазначаць наведвальніка, сябра, а рысу характару чалавека, якому ўласцівы ветлівы прыём, сардэчнасць, пачалі называць гасціннасцю. У сучаснай беларускай мове сінонімам да гэтага слова з’яўляецца «хлебасольства». Шматлікія прыказкі і прымаўкі пра гасціннасць беларусаў можна аб’яднаць у наступныя групы:

- ветлівае стаўленне да госця («Прыглядай гасцей, каб хадзілі часцей», «Госцю трэба дараваць, а гаспадару — прамаўчаць»);
- прыём госця залежыць ад яго асабістых якасцей («Добраму госцю вароты самі расчыняюцца», «Які госць, такое і частаванне»).

Прыказкі рэгламентуюць і паводзіны гасцей. У прыватнасці, не прынята злоўжываць ветлівасцю гаспадароў і гасцяваць залішне доўга: «Добры той госць, які гасцюе нядоўга», «Пара гасцям і меру ведаць», «Госць





першы дзень — золата, другі — серабро, а трэці — медзь, хоць і дадому едзь», «Чым госць радзейшы, тым мілейшы».

Гасціннасць беларусаў адзначаецца ў многіх літаратурных творах, напрыклад: «Ведаючы шчырую беларускую гасціннасць, зварочваю туды на адпачынак» (Ян Баршчэўскі. «Шляхціц Завальня»); «Важны быў гэта народ, і паміж суседзямі меў ён добрую песню і праўдзівае паважанне... Госці ведалі, што народ, да якога ім дарога належала, быў сэрца мяккага, рупны гасцінаю і багаццем асаблівым адзначаўся» (Янка Купала. «Як у казцы...»). У паэме «Новая зямля» Якуба Коласа ёсць радкі:

Вайшоў Кандрат і павітаўся<br>
і пра здароўе распытаўся.<br>
Дарота, Пальчыха старая,<br>
таксама хлебам дом вітае —<br>
такі ўжо звычай беларускі,<br>
у клумку выпіўка, закускі.

Пра гасціннасць пісаў Уладзімір Караткевіч у эсэ «Зямля пад белымі крыламі»: «Усе, хто прыязджае да нас, адзначаюць як адну з галоўных рыс — гасціннасць, пачасту досыць цяжкую для госця. «Госць у хаце — Бог у хаце» — і ганьба таму дому, дзе не зробяць усяго, нават немагчымага, каб госць быў задаволены».

## ЖАЛЕ́ЙКА, дудка, пішчык, ражок, чаротка

**Старажытны народны духавы язычковы музычны інструмент у выглядзе дудкі, звычайна з раструбамі.**



На аснове мясцовых уласцівасцей жалейка можа адрозніВацца матэрыялам, з якога зроблена (драўніна, саломінка, гусінае пяро, чарот, рог), колькасцю адтулін, прынцыпамі вырабу і мацавання язычка. Гучанне яе моцнае, рэзкае. Ігралі на жалейцы сола і ў ансамблі са скрыпкай, цымбаламі, гармонікам. Выканаўцаў на гэтым інструменце называлі «жалеечнікамі». Яны выконвалі песенныя і танцавальныя мелодыі, вясельныя маршы. Былі і журботныя пастухоўскія найгрышы.



Жалейка часта ўпамінаецца ў беларускім фальклоры і ў паэзіі. Пад назвай «Жалейка» выйшаў першы зборнік вершаў Янкі Купалы, выдадзены ў пачатку 1908 года.



# КАЛЫХА́НКА



**Песня, якую спяваюць, калі калышуць дзіця.**

Вершы-калыханкі ёсць у творчасці Янкі Купалы, Змітрака Бядулі, Рыгора Барадуліна, Алеся Камоцкага і іншых пісьменнікаў.

У эфіры Беларускага тэлебачання штодзень з 1981 года выходзіць перадача для дзяцей «Калыханка». Яе вядучыя — дарослыя акцёры і лялечныя персанажы (Дзед-Барадзед, Буслік, медзведзяня Топа і іншыя героі) абмяркоўваюць розныя тэмы, якія хвалююць беларускіх дзяцей. У канцы тэлеперадачы паказваецца мультфільм і гучыць песня-калыханка «Доўгі дзень» на словы Генадзя Бураўкіна і музыку Васіля Раінчыка.



# КАХА́ННЕ




**Вялікае сардэчнае пачуццё да пэўнай асобы.**

У беларускай мове словы «каханне» і «любоў» абазначаюць падобныя, але не тоесныя пачуцці. Каханне абазначае інтымнае пачуццё паміж мужчынам і жанчынай, у той час як любоў — прыязнасць да рэчаў і з'яў, іншых людзей.

Найбольш знакамітыя вершы пра каханне — «Явар і каліна» Янкі Купалы, «Зорка Венера» Максіма Багдановіча, «Пахне чабор» Петруся Броўкі.





# КРО́СНЫ

**Ручны ткацкі станок; ніцяная аснова, якая навіваецца на навой станка.**

Пра старажытнае паходжанне кроснаў сведчыць іх распаўсюджанасць у многіх народаў. На кроснах выраблялі разнастайныя тканіны: ад грубай да найтанчэйшага палатна для намітак (галаўнога ўбору замужніх жанчын). Існуе беларускі народны танец «Кросны». У раённых цэнтрах Беларусі — Старых Дарогах і Лепелі — штогод праходзяць конкурсы ткацкага майстэрства «Матчыны кросны». У 2007 годзе рэжысёр Юрый Выдронак зняў дакументальны фільм «Старыя кросны».

# КУЛЬТ ПРО́ДКАЎ



**Пакланенне душам памерлых продкаў, асобныя вераванні ў іх боскасць і абрады іх ушанавання.**

Вучоныя (этнографы, гісторыкі) сцвярджаюць, што ў беларусаў яшчэ з дахрысціянскіх часоў існуе моцны культ продкаў. Продкі ўяўляюцца як гаспадары роднай зямлі. З пашырэннем хрысціянства культ продкаў захоўваўся ў народных вераваннях. Пры святкаванні Каляд, вяселляў, хрэсьбін прынята было спачатку пакінуць рытуальную ежу продкам і толькі потым самім прыступіць да святочнай вячэры. Існуюць спецыяльныя дні памінання продкаў — Дзяды і Радаўніца. Па падліках этнографаў, у беларускім народным календары існуе каля 15 памінальных дзён. У гэтыя дні прынята прыбіраць магілы памерлых родзічаў, праводзіць памінальныя вячэры.





## **КУ́ФАР**, скрыня

**Драўляная ёмістасць для захоўвання тканін, адзення, бялізны і каштоўнасцей; від мэблі.**

Куфры ў магнацкіх і мяшчанскіх інтэр'ерах часцей былі вялікія, драўляныя, з акоўкай па кантах, фарбаваныя ў чорны ці зялёны колер. У беларускім сялянскім інтэр'еры пашыраны з XIX стагоддзя. У пачатку XX стагоддзя сяляне сталі вырабляць куфры з прыгожым раслінным арнаментам (кветкі, лісткі).

У беларускай народнай культуры куфар быў культавым, магічным аб'ектам. Кожная нявеста захоўвала ў ім свой пасаг і іншыя каштоўнасці: ручнікі, кашулі, андаракі (спадніцы), хусткі, фартухі. Куфар выкарыстоўваўся ў многіх абрадах беларускага вяселля.

Часта сустракаецца ў казках і паданнях, дзе найчасцей утрымлівае ў сабе золата і каштоўнасці, ахоўваецца міфічнымі істотамі або затоплены ў возеры. У сучасных музейных экспазіцыях куфар займае цэнтральнае месца. Напрыклад, у Літаратурным музеі Максіма Багдановіча захоўваецца стогадовы куфар, які належаў каханай паэта.

«Куфар» — назва беларускай гандлёвай інтэрнэт-пляцоўкі.

# ЛЯ́ЛЬКА



**Дзіцячая цацка ў выглядзе фігуркі чалавека, а таксама макет фігуры чалавека ці жывёлы для тэатральных прадстаўленняў.**

Лялька можа быць зроблена з тканіны, паперы, дрэва, фарфору, пластмасы і іншых матэрыялаў. Продкі беларусаў верылі ў цудадзейную сілу лялек, быццам яны могуць ахоўваць і абараняць ад злых сіл, дарыць здароўе, мудрасць, удачу і шчасце. Вядомы лялькі-абярэгі, выкананыя ў мностве арыгінальных тэхнік.

У сучаснай культуры нарастае цікавасць да аўтарскай лялькі. У краіне праходзяць іх шматлікія выставы. Не страчваюць сваёй папулярнасці лялечныя тэатры, якія працуюць у Мінску, Маладзечне, Магілёве, Гродне, Гомелі, Віцебску, Брэсце.





# ПАРО́Г

**Бервяно або брус у ніжняй частцы праёма дзвярэй; у пераносным значэнні — пярэдадзень, мяжа чаго-небудзь.**

Парог мае сімвалічнае значэнне ў беларускай культуры, што адлюстравалася ў прымхах: ад парога хату не месці, не сядзець незамужняй дзяўчыне на парозе, не вітацца за руку цераз парог. Рытуалы з парогам выконваліся падчас вяселля (напрыклад, пры сватанні сват, пераступіўшы парог, нізка кланяўся і называў парог «залатым»), хрэсьбін (па вяртанні з царквы ахрышчанае дзіця маглі пакласці ненадоўга на парог хаты). Лічылася, што парог — мяжа паміж сваёй, абжытай тэрыторыяй (хатай) і чужой. Таму беларусы стараліся абараніць сваю тэрыторыю з дапамогай пэўных дзеянняў з парогам (вывешванне зёлак, закопванне пэўных прадметаў).



# ПЕЧ

**Цаглянае або каменнае збудаванне ў хаце, у якім разводзяць агонь, каб згатаваць ежу, нагрэць памяшканне.**

Беларусы печ шанавалі і адносіліся да яе як да жывой істоты. Лічылі яе месцам жыхарства Дамавіка. Печ, як і парог, мае сімвалічнае значэнне ў беларускай культуры, што адлюстравалася ў прыказках і прымаўках: «Печ у хаце — другая маці», «Сядзець як мыш за печкай». Адзначаны і загадкі пра печ: «Яна галодная — хата халодная, яна пад'ела — у хаце пацяплела».







# РУЧНІ́К

**Вузкі прадаўгаваты кавалак тканіны для выцірання твару, рук, цела ці посуду.**

У залежнасці ад прызначэння і функцыі ручнікі маюць розныя назвы. Кавалак тканіны без дэкору ці з вузенькімі палоскамі-ператыкамі па краях, які выкарыстоўваюць для побытавых патрэб (імі ў паўсядзённым жыцці выціралі рукі і твар), называюць уціральнікам, уцірачом, уціркай. Ручніковая тканіна, прызначаная для ўпрыгожвання абразоў і бажніц, называлася набожнікам. Сувязь гэтай рэчы з абраза́мі, з чырвоным кутом адлюстравана ў лакальных назвах: набразнік, абразны ручнік, накутнік, багавік, завеска, плат, платок, набожны платок. Ён вылучаўся выразнай дэкаратыўнасцю і пэўнай даўжынёй, якая магла быць ад 2 да 5 метраў у залежнасці ад памераў бажніцы і колькасці абразоў. Аброчныя (запаветныя), ці ручнікі-абярэгі, прыносяць па абяцанні ці запавеце на абракальныя, прыдарожныя крыжы, прошчы, святыя крыніцы, святыя дрэвы як ахвяру, дар, сродак усталявання чалавекам кантакту з вышэйшым светам, індывідуальную просьбу да Бога. Выраблялі спецыяльныя аброчныя ручнікі, якія ахвяравалі ў царкву



ці касцёл, капліцу ў крызісныя сітуацыі (засуха, эпідэмія, вайна, хваробы дзяцей). На Палессі многія жанчыны ткалі спецыяльныя ручнікі-абярэгі для ўсёй сям'і і выкарыстоўвалі ў лекарскіх мэтах, для захавання хатняй жывёлы і паляпшэння дабрабыту. Іх трымалі за абраза́мі, але пры неабходнасці бралі з сабой у далёкую дарогу. Ручнікі-абярэгі пераходзілі з пакалення ў пакаленне.

Ручнік быў адным з папулярных прадметаў гарадскога і сялянскага побыту ўжо ў часы Сярэдневякоўя. У той час ручнік набыў адзнакі каштоўнай дэкаратыўнай рэчы і разам з іншымі мастацкімі тканінамі з'яўляўся прадметам гандлю пад назвай «полотенце шитое литовское». Падобны да ручніка выраб адлюстраваны на гравюры Францыска Скарыны, змешчанай у Бібліі 1517—1519 гадоў, дзе асветнік паказаны за маленькім рабочым столікам, пакрытым багата арнаментаваным ручнікам. Традыцыйна беларускі ручнік ткаўся з ільну.





# СПАДА́Р

**Адна з форм афіцыйнага ветлівага звароту да іншага чалавека ў беларусаў; у жаночым родзе — «спадарыня» або «спадарычна» (да незамужняй жанчыны), пры звароце да некалькіх чалавек — «спадарства».**

Слова ўтварылася ад слова «гаспадар» шляхам паступовага спрашчэння: спачатку знікла прыстаўное «г», потым прыстаўное «а». Словы тыпу «спадар», «аспадар», «аспадарства» выкарыстоўваліся ўжо ў старабеларускіх тэкстах.

# СЯМ'Я́



**Група людзей, якая складаецца з мужа, жонкі, дзяцей і іншых блізкіх сваякоў, якія жывуць разам; у пераносным значэнні — група людзей, аб'яднаных агульнымі інтарэсамі.**

Як і ў кожным грамадстве, роля сям'і для беларусаў вельмі важная. Адметнай рысай паводзін беларусаў у традыцыйнай сямейнай культуры выступае павага да старэйшых, што сцвярджаецца сямейным і грамадскім уладкаваннем. У сям'і зберагаюцца найважнейшыя каштоўнасці: асабістая адказнасць кожнага яе члена за даручаную яму справу, узаемадапамога і ўзаемавыручка, сумленнасць, добразычлівасць, сціпласць, павага да працы і працоўнага чалавека.

У беларускай культуры захавалася багатая сямейная абраднасць беларусаў: радзіны, вяселле, хрэсьбіны, пахавальныя традыцыі, а таксама шматлікія рытуалы, накіраваныя на захаванне моцнай сям'і і выхаванне дзяцей. У сферы сямейных стасункаў беларусы заўсёды лічылі, што стварэнне сям'і — гэта вельмі адказная справа, адсюль прыказка: «Ажаніцца — не ўпасці: не ўстанеш, не атрасешся».





# ТАЛАКА́

**Калектыўная дапамога пры выкананні работ (пераважна сельскагаспадарчых).**

Слова не мае адпаведнікаў у іншых мовах, таму можа быць перакладзена толькі апісальна. Як адзначаюць вучоныя, сваёй знешняй формай яно дэманструе адметную рысу беларускага вымаўлення — аканне, а глыбінны сэнс яго — адлюстраванне гасціннасці, добразычлівасці, шчодрасці, працавітасці беларусаў. Рыгор Барадулін называў слова «талака» «даўнім, наскім, цёплым». Талака складалася з некалькіх этапаў: запрашэнне сваякоў, суседзяў, аднавяскоўцаў для цяжкай працы, якую складана выканаць паасобку (паставіць зруб ці дах хаты, загатовіць сена і іншыя работы), сумесную працу і талочнае застолле з характэрнымі песнямі («Талака, талака талачылася...», «Талачу, талачу, гарэлкі хачу...»). З цягам часу такія супольныя віды працы атрымалі ўласныя назвы: дажынкі, дакопкі, дасеўкі. Існуе прымаўка: «Талакой можна і бацьку біць», што значыць — сумесна лёгка зрабіць любую справу.

У беларускай мове талакой называюць таксама бязладны натоўп людзей, зборышча насякомых у паветры, а таксама багіню — апякунку жніва і ўрадлівасці.

# ХАТНЯЯ І СВОЙСКАЯ ЖЫВЁЛА

## КАРО́ВА

**Буйная свойская парнакапытная жывёла, адна з найбольш рана прыручаных чалавекам.**

Карова заўсёды займала адно з галоўных месцаў сярод свойскай жывёлы. Яна давала пэўны статус гаспадару («Што гэта за гаспадар без каровы!»), пэўную далучанасць да спраў абшчыны (найманне пастуха для статка, удзел у рытуалах першага выгану на пашу, вызначэнне пастухоў-падпаскаў).

У адносінах да каровы выконвалі шэраг ахоўных дзеянняў: на Вадохрышча паілі святой вадой, на Грамніцы абносілі запаленай свечкай і прыпякалі трошкі поўсці на галаве, у дні Тройцы і Купалля на шыю карове вешалі вянок-абярэг.

У чарадзейных казках карова выступае апякункай дзяўчыны-сіраты.





# КОНЬ

**Буйная свойская няпарнакапытная жывёла, якая выкарыстоўваецца для перавозкі грузаў і людзей, а таксама для верхавой язды.**

Конь доўгі час быў адной з галоўных жывёл у сялянскай гаспадарцы. Менавіта для каня гаспадар сеяў адмысловыя культуры — канюшыну і авёс. Вобраз каня ў мастацкай літаратуры і фальклоры прадстаўлены як вобраз надзейнага спадарожніка і вернага памочніка чалавеку.

Працавітасць каня, яго важная роля ў гаспадарцы падкрэсліваюцца ў беларускіх прыказках і прымаўках: «Вялікаму каню — вялікі хамут», «Каторы конь цягне, таго і паганяюць», «Шануй каня дома, а ён цябе ў дарозе».

У раманах «Дзікае паляванне караля Стаха», «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча згадваюцца дрыкганты — коні старадаўняй пароды, якая была распаўсюджана на беларускіх землях, але да нашага часу не захавалася: «Гэта былі сапраўдныя палескія дрыкганты, парода, ад якой зараз нічога не засталося. Усе ў палосах і плямах, як рысі або леапарды, з белымі ноздрамі і вачамі, якія адлівалі ўглыбіні чырвоным агнём».

У пачатку XXI стагоддзя была зарэгістравана парода коней беларуская запражная — адзіная нацыянальная парода коней. Яе прадстаўнікі вылучаюцца цягавітасцю, доўгажыхарствам, пладавітасцю да 26-гадовага ўзросту.

З 2011 года ў Мінску штогод праходзіць Міжнародная выстава пародзістых коней, якая збірае вядучых заводчыкаў і прадстаўнікоў коннай індустрыі з Беларусі і замежжа. У рамках выставы арганізуюцца паказы парод, спаборніцтвы, касцюміраваныя выездкі, шоу скакуноў, выступленні конна-гістарычных клубаў.

Конныя шпацыры і катанне на брычках прапаноўваюць у многіх аграсядзібах, этнаграфічных комплексах, заапарках.



# КОТ

**Хатняя млекакормячая жывёла сямейства кашэчых.**

Кот — найбольш часты і любімы персанаж калыханак, забаўлянак і дзіцячага фальклору ў цэлым. У дзіцячых казках найчасцей паўстае як разумны, мудры, справядлівы герой.

У беларускай мове слова «кот» замацавалася ў наступных фразеалагізмах: кату па пяту — вельмі малы ростам; як кот наплакаў — пра нязначную колькасць чаго-небудзь; купіць ката ў мяшку — набыць што-небудзь, не ведаючы чаго-небудзь. Існуе нямала прыказак з прымаўкамі, у якіх згадваецца кот: «Добрае слова і кату прыемна», «Мінулася кату масленіца», «Поначы ўсе каты шэрыя».





# КУ́РЫЦА

**Свойская птушка атрада курыных, якую разводзяць для атрымання яек і мяса.**

Развядзенне курэй было неад'емнай часткай хатняй гаспадаркі ўсходніх славян. У народнай культуры беларусаў курыца ўвасабляла пладавітасць, мацярынскі інстынкт. Яна выступала ў рытуальных дзеяннях як маркер падчас «пераходу з аднаго стану ў іншы» ў каляндарным, зямельным або жыццёвым цыкле. Так, пасля павароту сонца на лета ў народзе казалі, што дзень павялічыўся на «курыны крок»: «на Каляду прыбыла дня на курыную ступню».

Вобраз курыцы пашыраны ў беларускай фразеалогіі: класціся з курамі — класціся спаць вельмі рана; курам на смех — нешта вельмі смешнае; куры не клююць — вельмі многа (звычайна пра грошы); куры засмяюць — пра таго, хто робіць што-небудзь недарэчнае. Вобраз курыцы адлюстраваны ў беларускіх прыказках і прымаўках: «Адна толькі курыца грабе ад сябе», «Скажы курыцы, дык яна па ўсёй вуліцы», «Яйка курыцу не вучыць».





# ПЕ́ВЕНЬ

**Самец курыцы; у пераносным значэнні — задзірысты чалавек, забіяка.**

Слова шырока выкарыстоўваецца ў фразеалагізмах: да пеўняў або з пеўнямі (устаць, падняцца) — вельмі рана, на досвітку; пусціць чырвонага пеўня — учыніць пажар, падпаліць. Вобраз пеўня адлюстраваны ў беларускіх прыказках і прымаўках: «На сваім сметніку і певень гаспадар»; «Не заўсёды світае, як певень спявае»; «Не лезь, певень, туды, дзе гусі пасуцца».

# ПЧАЛА́



**Насякомае, якое перапрацоўвае кветкавы нектар у мёд.**

Пчала — сімвал руплівасці і стараннасці. Беларусы здаўна займаліся пчалярствам і бортніцтвам — развядзеннем пчол і збіраннем мёду. Раней людзі збіралі мёд дзікіх пчол, выкурваючы іх з борцяў дымам, адсюль прыказка: «Не пагнётшы пчолаў, мёду не ядуць». Развядзенне пчол упамінаецца ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага, па-мастацку апісана ў паэме «Новая зямля» Якуба Коласа. Багацце і шчодрасць Радзімы падкрэсліваецца ў прыказцы «На Беларусі пчолы як гусі».





# САБА́КА

**Хатняя млекакормячая жывёла сямейства сабачых.**

Паходзіць ад ваўка, прыручаны каля 10-га тысячагоддзя да нашай эры. Існуюць сотні парод сабак, якія істотна адрозніваюцца адна ад адной. Падзяляюцца на тры асноўныя групы: дэкаратыўна-пакаёвыя, паляўнічыя, службовыя. Беларусы часта ўтрымліваюць сабак дома, у вёсках у спецыяльных маленькіх доміках — будках. Дзіця сабакі называецца шчаня (шчанюк).

Вобраз сабакі часта згадваецца ў беларускіх прыказках і прымаўках: «На смелага сабакі брэшуць, а баязлівага рвуць», «Сабака брэша — вецер носіць», «Як сабака на сене: і сам не гам, і другому не дам», «Як сабаку кормяць, так сабака і брэша», «Бег сабака за калёсамі, мусіць бегчы і за санямі», «Маленькі сабачка да старасці шчанюк».

# СВІННЯ́

**Парнакапытная млекакормячая жывёла, свойскі від якой разводзяць для атрымання сала, мяса, скуры, шчаціння.**

Для свіней характэрны кампактны целасклад і доўгая морда з пятачком, прыстасаваным для разрыхлення зямлі ў пошуках корму. Валасяное покрыва рэдкае, складаецца ў асноўным са шчаціння, мае капыткі. Дзіця свінні называецца парасём. Свіней ці парасят могуць ласкава называць «віславухімі віскунамі». Сярод самых распаўсюджаных мясцовых парод літоўская, чавуская, беларуская чорнараба́я і беларуская белая буйная. Свінагадоўля — развітая галіна жывёлагадоўлі ў Беларусі.

Традыцыйна свіней трымалі і на прыватных сялянскіх падворках, забівалі звычайна на зімовыя святы, выраблялі шматлікія стравы з мяса свінні (адсюль прыказка: «Не ўдзеліш свінцы ласкі — не адведаеш каўбаскі»). Вобраз свінні прысутнічае ў беларускай міфалогіі, фальклоры, літаратуры, мастацтве, а ў прыказках і прымаўках, выкарыстоўваючы яго, часта апісваюцца якасці чалавека: «Ціхая свіння глыбока рые», «Каб свінні рогі, не саступіла б з дарогі», «Пусці свінню пад стол, то яна захоча і на стол», «Ці свінні елі, ці шляхта папасвалася», «Якая на свінні шэрсць, такая ёй і чэсць», «Як свінню ні кліч, яе заўсёды выдасць лыч».

У пераносным значэнні так гавораць пра таго, хто робіць каму-небудзь непрыемнасці, пра няўдзячнага чалавека (размоўнае), падобнае значэнне мае вытворнае ад слова «свіння» слова «свінства».



# АДЗЕННЕ



## БЕЛАРУ́СКІ НАЦЫЯНА́ЛЬНЫ КАСЦЮ́М

**Ансамбль адзення, які адлюстроўвае менталітэт, характар, узровень духоўнай і матэрыяльнай культуры народа.**

На тэрыторыі Беларусі традыцыйны касцюм мае мноства лакальных варыянтаў, якія адрозніваюцца непаўторнай мясцовай адметнасцю. Традыцыйны беларускі жаночы касцюм складаецца з доўгай кашулі, палатнянай, паўшарсцяной або шарсцяной спадніцы-андара́ка, камізэлькі, шматслой-





нага галаўнога ўбору. Згодна з традыцыяй, да шлюбу дзяўчыне дазвалялася хадзіць з непакрытай галавой. Пасля замужжа, выходзячы на вуліцу, жанчына павінна была хаваць валасы пад хустку або намітку. Аснову традыцыйнага беларускага мужчынскага касцюма складаюць кашуля, штаны (нагавіцы), камізэлька і пояс. Вопраткай служаць світка (яна вырабляецца з валянага сукна) і кажух, пашыты з вырабленай скуры жывёл. Самыя распаўсюджаныя колеры ў беларускай народнай традыцыі — белы, чырвоны, чорны і сіні. Арнаментыка беларускага нацыянальнага касцюма складаецца пераважна з геаметрычных і раслінных узораў. Асноўным матэрыялам для касцюма з'яўляецца лён. Вялікая калекцыя народнага касцюма з разнастайных рэгіёнаў краіны прадстаўлена ў Музеі старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.







# АНДАРА́К

**Паясное адзенне беларускіх жанчын — спадніца з шарсцяной ці паўшарсцяной саматканкі ў клетку або ў падоўжаныя ці папярочныя палосы.**

У беларускай мове сустракаецца прыказка: «Пазнаюць нашу дачку і ў андарачку», якая азначае, што добра выхаванага чалавека з вядомага роду людзі будуць паважаць і ў простым адзенні. У 1920-я гады андарак пачаў выходзіць з ужытку. У сучасным маўленні словам «андарак» называюць спадніцу з натуральнага матэрыялу з арнаментам.



# АРНА́МЕНТ

**Узор, у аснове якога ляжаць геаметрычныя, раслінныя і жывёльныя матывы, што паўтараюцца ў строга вытрыманым стылі.**

У беларускім народным мастацтве вядомы тканы, вышываны, плецены, набіваны, аплікацыйны, ляпны, гравіраваны, разьбяны, маляваны і іншыя арнаменты. Характэрныя рысы беларускага арнаменту найбольш выразна выяўлены ў народнай вышыўцы, ткацтве, разьбе па дрэве, кераміцы. Арнаменты ў тканых, выцінаных, вышываных вырабах здаўна мелі не толькі эстэтычнае, але і сакральнае значэнне. Самым распаўсюджаным беларускім узорам арнаменту быў геаметрычны: крыжы, мадыфікаваныя ромбы, аб'яднаныя ў складаныя кампазіцыі. У пачатку XXI стагоддзя нацыянальны арнамент шырока выкарыстоўваецца ў масавай культуры, у аздабленні адзення, аксесуараў, посуду.

У беларускай мове з'явіліся новыя словы: вышымайка (майка з нанесеным арнаментам); вышыванка-па́ці (вечарына, дзе прысутныя апрануты ў нацыянальныя строі). Арнамент шырока выкарыстоўваецца пры





аздабленні ўпакоўкі тавараў (напрыклад, на скрынях Белпошты), адзення, аксесуараў, розных архітэктурных форм.

У 1951 годзе стужка з нацыянальным арнаментам стала складнікам сцяга Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (БССР). Прысутнічае яна і на сучасным сцягу Рэспублікі Беларусь.






## БРЫЛЬ, капялюш

**Мужчынскі галаўны ўбор, элемент традыцыйнай мужчынскай вопраткі беларусаў.**

Рабілі брылі плеценыя (з саломы, мятліцы, лазы, чароту) з шырокімі палямі, якія насілі летам, і валеныя, лямцявыя, якія насілі ў любую пару года. Найчасцей іх надзявалі сяляне, ідучы ў поле, каб абараніць галаву ад сонечных прамянёў, святочныя брылі паверх палёў абвязвалі каляровымі стужкамі і ўпрыгожвалі штучнымі кветкамі. Летнія брылі вызначаюцца разнастайнасцю прыёмаў пляцення (зубчыкамі і прама), іх прашывалі ніткамі ці конскім воласам.



# ВЫШЫВА́НКА

**Традыцыйная вышываная мужчынская і жаночая кашуля. Вышыванкай таксама называюць і традыцыйны беларускі ўзор, размешчаны на прадметах адзення і іншых рэчах.**

Вышываным геаметрычным арнаментам пачалі аздабляць адзенне яшчэ ў часы Сярэдневякоўя. У 1913 годзе беларускія актывісты, якія збіралі прадметы народнай творчасці, упершыню выставілі вышываныя строі на грамадскі агляд на Першай раённай выставе саматужнага промыслу і народнай творчасці беларускіх і літоўскіх майстроў, што праходзіла ў Вільні. З пачаткам працэсу мадэрнізацыі і індустрыялізацыі сама-





робнае і вышыванае адзенне было выцеснена з паўсядзённага ўжытку, але яго пачалі шырока выкарыстоўваць шматлікія ансамблі і гурты народнай творчасці, што ўтвараліся пры дамах культуры, школах. Сёння ў Беларусі сярод моладзі і дзелавых людзей адзенне і аксесуары ў нацыянальным стылі становяцца ўсё больш папулярнымі. Падобная прадукцыя шырока прадстаўлена ў спецыялізаваных магазінах тавараў лёгкай прамысловасці, на выставах і кірмашах.

З 2016 года ў Мінску праводзіцца Дзень вышыванкі.



# ВЯНО́К



**Сплеценыя ў кружок лісты, кветкі.**

Вера беларусаў у цудадзейную моц вянка знайшла сваё выражэнне ў разнастайнасці яго відаў: вясельныя, рытуальныя, святочныя (на Купалле, Тройцу), пахавальныя і інш. Вянок можа вырабляцца са свежай зеляніны і кветак, радзей — з вечназялёных раслін, хвоі, сухіх ветак і кветак, саломы, тканіны. Вясельны вянок — адзін з асноўных атрыбутаў вясельнага абраду. Па вянках варажылі на лёс. Калі вянок доўга не будзе сохнуць, то дзяўчыну чакае шчаслівае каханне, а калі вянок завяне, то, значыць, каханне будзе нядоўгім. Па народнай традыцыі,








хлопцу, якому адмовіла пры сватанні дзяўчына, жартаўліва маглі надзець на галаву вянок з гароху.

Вянком таксама называюць складзенае бярвенне ў зрубе хаты.

Ускладанне рытуальных вянкоў з'яўляецца традыцыйнай часткай урачыстасцей і памінальных мерапрыемстваў з нагоды Дня Перамогі.

«Вянок» — назва адзінага прыжыццёвага зборніка вершаў вядомага беларускага паэта Максіма Багдановіча. У гісторыі нацыянальнай паэзіі зборнік стаў адным з лепшых узораў паэтычнага майстэрства. Ён змяшчаў 92 вершы і 2 паэмы, размешчаныя на 120 старонках, якія былі аб'яднаны па цыклах. «Вянок» быў выдадзены ў пачатку 1914 года намаганнямі рэдакцыі газеты «Наша ніва» ў віленскай друкарні Марціна Кухты.

# ЛА́ПЦІ

**Плецены абутак з лыка (лазовага, ліпавага), пяньковых або льняных вітушак ці тонкіх вяровачак; у пераносным значэнні — праставаты, адсталы, некультурны чалавек.**

Этнаграфічныя матэрыялы сведчаць, што лапці ў якасці абутку былі вядомы беларусам з даўніх часоў. Пляценне лапцей не было характэрна для гараджан, бо лічылася справай простага люду. Лапці былі традыцыйным сялянскім абуткам. Яны таксама ўжываліся амаль ва ўсіх сферах духоўнага жыцця чалавека (на наваселлі, у пахавальнай абраднасці, у якасці ахвярапрынашэння продкам).

Слова «лапаць» часта ўжываецца ў складзе фразеалагізмаў: ляпнуць як лапцем па балоце — вельмі недарэчна, нетактоўна сказаць што-небудзь;









абуваць у лапці — паступаць нядобрасумленна, ашукваць, хітраваць, падманваць; сёрбаць (есці) лапцем боршч — гібець у беднасці, галечы, быць адсталым, некультурным.

Слова «лапаць» таксама сустракаецца ў беларускіх прыказках і прымаўках: «Бот лапцю не пара» (хто-небудзь не раўня каму-небудзь); «Бывала, варона лапці абувала, а цяпер грак ходзіць так» (няма чаго ўспамінаць тое, што было калісьці); «Гаспадарку весці — не лапці плесці» (пра важнасць умення весці гаспадарку); «Хоць муж (мужык) як лапаць, абы з ім не плакаць» (пра памяркоўныя адносіны жонкі да мужа, калі ён не строгі, не суровы); «Чорт не адну пару лапцей стаптаў, пакуль такую пару сабраў».

# СВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ПРЫРОДЫ

# БЕЛАРУСКІЯ ЛАНДШАФТЫ

## БАЛО́ТА

**Нізкае багністае месца са стаячай вадой; у размоўнай мове пад балотам разумеюць вялікую гразь на вуліцы, у двары.**

Слова мае славянскае паходжанне і роднаснае да літоўскага ba̍ltas (белы). З прычыны шырокай распаўсюджанасці балот у прыродным ландшафце Беларусі ў беларускай мове існуе больш за 20 слоў, якія адносяцца да балота: алёс, багна, багніва, балота, бездань, гала, дрыгва, імшарына, мроіва, нетра, твань і іншыя словы. Большасць з іх не мае адпаведніка ў іншых мовах.

Слова «балота» прадстаўлена ў фразеалогіі і прыказках і прымаўках: «Жыве кулік, дзе прывык, і кожны роднае балота хваліць»; «Жаба квокча, сваё балота хваліць»; «Было б балота, а чэрці знойдуцца»; «Балота без чорта не будзе»; «Дрыжыць, як дрыгва».



Слова «балота» (або яго корань) прысутнічае ў назвах беларускіх гарадоў, мястэчак яўна (вёскі Белае Балота, Балоціна, Балотнікі) і зашыфравана (напрыклад, назва Віцебска паходзіць ад назвы ракі Віцьбы, у аснове якой старажытны корань віць — топкае месца, балота). На тэрыторыі Беларусі амаль 60 вёсак Забалоцце, 8 — з назвай Забалаць!

У беларускай міфалогіі балота асацыіруецца з дрэнным, нячыстым месцам. Негатыўнае стаўленне да балота можна патлумачыць небяспекай, якую яно нясе ў сабе. Згодна з беларускім фальклорам, балота насяляюць шматлікія міфічныя істоты: Аржавень, Багнік, Балотнік, Вадзянік, Вадзяніцы, Змяіны Цар, Чорт.

У беларускай літаратуры балота прысутнічае як у назвах твораў, так і тэксце. Знакаміты раман «Людзі на балоце» Івана Мележа апісвае жыццё палескай вёскі Курані, акружанай балотам. Аповесць Якуба Коласа «Дрыгва» прысвечана знакамітаму беларускаму партызану дзеду Талашу. Асноўнае дзеянне твора «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча праходзіла ў Балотных Ялінах.

Сёння актуальнай з'яўляецца праблема захавання балот, ліквідацыі наступстваў бяздумнай меліярацыі «лёгкіх Еўропы». Беларускія балоты займаюць 6,1% тэрыторыі краіны і адыгрываюць выключную ролю ў фарміраванні мікраклімату рэгіёна.



# ВАЛУ́Н



**Вялікі камень, абломак горнай пароды.**

Валуны — сведкі ледніковых эпох. У геалагічнай гісторыі Беларусі пяць разоў адбывалася нашэсце вялікіх мацерыковых абледзяненняў.

У беларускай мастацкай традыцыі валун — сімвалічны вобраз. Да яго звяртаюцца паэты і празаікі. Напрыклад, «Лявон падбіраў словы цяжка, нібы цягаў валуны на полі» (Васіль Быкаў. «Знак бяды»). У рамане «Каласы пад сярпом тваім» Уладзімір Караткевіч называе галаву мядзведзя «цяжкай, як валун». Ледніковыя валуны з'яўляюцца неад'емнай часткай беларускага пейзажу, што знайшло адлюстраванне ў вершы «Жыта, сосны, валуны» Ніла Гілевіча.





Дзе па роднай зямлі ні крочыў —
скрозь — ад Прыпяці да Дзвіны —
перш за ўсё мне ласкалі вочы
жыта, сосны і валуны.

У легендах, якія захаваліся дагэтуль на Магілёўшчыне і Віцебшчыне, сцвярджаецца, што ў камянях ці паблізу ад іх жылі ў старажытнасці страшныя вогненныя цмокі ці асілкі, варажбіты. Урэшце і сам валун мог быць акамянелым чалавекам, пра што па-мастацку распавядае ў вершы «Акамянелыя волаты» Максім Танк:

Зусім не
нейкі там
скандынаўскі ляднік
зямлю нашу
сваімі валунамі
засеяў.
Гэта акамянелыя
волаты спяць,
што свой край баранілі.

У старажытнасці валуны абагаўляліся. Захаваліся валуны з імёнамі язычніцкіх багоў Перуна, Вялеса, Дажбога. Некаторым людзі прыносілі ахвяры: ежу, дробную свойскую жывёлу, кветкі, манеты. Са з'яўленнем хрысціянства на беларускіх землях змянілася і стаўленне да валуноў. Сусветна знакамітымі з'яўляюцца Дзвінскія камяні (ляжалі, а некаторыя і сёння ляжаць у рацэ Дзвіне). Іх яшчэ называюць «пісанікамі». Адзін з такіх «пісанікаў» — Барысаў камень. На ім высечаны крыж і надпіс-маленне.

Сёння валуны ўпрыгожваюць гарадскія ландшафты беларускіх гарадоў. Па ініцыятыве акадэміка Гаўрылы Гарэцкага ў 1974 годзе ў Мінску быў створаны адзін з найлепшых у Еўропе музей валуноў пад адкрытым небам.



# ВО́ЗЕРА

**Прыродны вадаём, які ўяўляе сабой катлавіну, запоўненую вадой, і не мае непасрэднага злучэння з акіянам.**

У Беларусі каля 10 800 азёр. Сумарная плошча амаль 2000 квадратных кіламетраў. Размешчаны ў асноўным на поўначы (Беларускае Паазер'е) і на поўдні (Палессе) краіны.

Утварэнне большасці азёр Беларускага Паазер'я звязана з дзейнасцю Паазерскага ледавіка і яго талых водаў. Катлавіны ледавіковых азёр разнастайныя:

- падпрудныя (Нарач, Асвейскае, Мядзел, Лукомскае) утвораны ў выніку намнажэння талых ледавіковых водаў у паніжэннях рэльефу;

- лагчынныя (Саро, Сянно, Балдук) узніклі з-за разбуральнага ўздзеяння талых водаў ледавіка на глебу;
- эразійныя (Рудакова, Вісяты, Жанно) выбіты сілай вады, якая вадаспадам сцякала з ледавіка;
- тэрмакарставыя (Лісіцкае, Усомля, Канашы) утвораны ў выніку раставання лінзаў лёду.

На Палессі азёрныя катлавіны іншыя:

- старычныя ўтвораны на месцы рэк, якія з цягам часу ператварыліся ў асобныя бяссцёкавыя вадаёмы;
- карставыя (Вулька, Сомінскае) утвораны на месцы правалу пласта зямлі;
- азёры-разлівы (Чырвонае, Олтушскае).

У Беларусі найвялікшае па плошчы возера — Нарач, найбольшую глыбіню мае возера Доўгае.

Назвы беларускіх азёр з'яўляюцца цікавымі для даследчыкаў мовы і гісторыі: так, балцкія назвы азёр (Доўжа, Дрывяты) з'яўляюцца сведчаннем балцкага элемента ў беларускай мове, назвы тыпу Святое адлюстроўваюць вераванні беларусаў. Інфармацыя пра азёры Беларусі сістэматызавана ў выданнях «Блакітная кніга Беларусі» (1994) і «Блакітны скарб Беларусі» (2007).



# КРЫНІ́ЦА



**Струмень вады, які выцякае з зямлі.**

Менавіта крыніцы даюць пачатак усім прыродным вадаёмам і папаўняюць іх свежай вадой. Вядомы сваімі лячэбнымі ўласцівасцямі, гаючай сілай. Многія з крыніц шануюцца са старажытных часоў. Каля іх будавалі язычніцкія капішчы, куды прыходзілі памаліцца багам, прынесці ахвяраванні — воўну, лён, кветкі. Пасля прыняцця хрысціянства побач з крыніцамі ставілі крыжы, узводзілі капліцы, змяшчалі абраз Маці Божай, распяцце, абразы ці фігуры святых. З цягам часу яны ператварыліся ў месцы паломніцтва (прошчы) і ў залежнасці ад змены канфесійнай сітуацыі пераходзілі з-пад апекі адной царквы да другой. Ва ўсіх кутках Беларусі яшчэ і сёння можна пачуць паданні, звязаныя са святымі крыніцамі. Асабліва часта згадваецца пра з'яўленне там цудадзейнага абраза або нават Маці Божай, якая ўказала сляпым шлях да вады, і тыя, прамыўшы вочы, станавіліся відушчымі. Паводле паданняў, некаторыя крыніцы ўтварыліся на месцы былых культавых будынкаў, якія праваліліся ў час набажэнства разам з людзьмі. Святыя крыніцы Беларусі ўяўляюць значную цікавасць як для звычайных людзей, вернікаў, турыстаў, так і для навукоўцаў — археолагаў, этнографаў, гісторыкаў, геолагаў.



# ЛЕС

**Масіў зямлі, зарослы дрэвамі; спілаваныя дрэвы як будаўнічы матэрыял.**

Лясныя масівы займаюць 39 % усёй тэрыторыі Беларусі. Яны неад'емная частка не толькі пейзажу, але матэрыяльнай і духоўнай культуры народа. У беларускай фразеалогіі падкрэсліваецца «неабжытасць» лесу, ён супрацьпастаўляецца грамадству:

- бяда не па лесе, а па людзях ходзіць — гаворыцца, калі з кімнебудзь здарылася бяда, няшчасце;
- глядзець у лес — мець намер вярнуцца да ранейшага, прывычнага;
- на сухі лес гнаць — выказванне незадавальнення, злосці на каго-небудзь;
- у лес не ўцячэ — яшчэ паспеецца, нічога не зробіцца з чым-небудзь;
- хто ў лес, хто па дровы — нязладжана, нядружна спяваць, гаварыць і падобнае;
- цёмны лес — абсалютна незразумелае, незнаёмае;
- сем вёрст да нябёс і ўсё лесам — вельмі многа і абы-чаго нагаварыць, наплесці і падобнае;





- воўк у лесе здох — здарылася нешта неспадзяванае;
- у лесе гадаваўся — няўмека, неспрактыкаваны чалавек.

Беларусы «насялілі» лес Лесуном (лесавіком), які ўвасабляе міфічную душу беларускага лесу. У вершы Максіма Багдановіча лясун — музы́ка, яго струны — сосны, лес — таямнічая арфа.

Здаўна беларусы працавалі ў лесе. Ляснічымі былі бацькі Міколы Гусоўскага і Якуба Коласа (быт сям'і лесніка паэт апісаў у паэме «Новая зямля»).

Лес для беларусаў быў і застаецца найважнейшай крыніцай розных рэсурсаў. Гэта пацвярджае беларуская прымаўка «Што ў лесе родзіцца — у хаце згодзіцца». Драўніна шырока выкарыстоўвалася ў штодзённым жыцці, дзякуючы гэтаму развівалася драўлянае дойлідства, промыслы, дрэваапрацоўчыя рамёствы.

Лес у залежнасці ад пераважнай расліннасці ў ім можа мець назвы дуброва (дубовы лес), бор (сасновы лес), ельнік (яловы), пушча (вялікі, густы, запаведны лес), а таксама гай, рошча.

Ад гэтых слоў утварылася вялікая колькасць назваў населеных пунктаў Беларусі: Альшанікі, Баравое, Беразнякі, Вялікі Бор, Дубраўка, Залесавічы, Пушча. У залежнасці ад сімволікі дрэў у беларускай культуры ўзнікла народная прыказка: «У сасновым лесе — маліцца, у бярозавым — любіцца, у дубовым — волю каваць, а ў яловым — душу д'яблу прадаваць» (паводле Уладзіміра Караткевіча).

# РАСЛІНЫ

## БЯРО́ЗА

**Род лістападных дрэў і кустовых раслін сямейства бярозавых.**

Нашы продкі лічылі бярозу дрэвам-першапродкам, дрэваахоўнікам і правадніком паміж светам жывых і светам памерлых. Дрэва сімвалізуе жаночы пачатак і менавіта таму стала асноўным сімвалам шэрага святочных рытуалаў і абрадаў, асноўнымі ўдзельнікамі якіх былі дзяўчаты перадшлюбнага ўзросту. Напрыклад, у чацвер траецкага тыдня дзяўчаты збіраліся гуртам і ішлі «завіваць бярозкі»: прыгіналі вершаліны двух блізкіх дрэў і папарна сплялі іх у вянок, а пасля выконвалі абрад кумлення — кожная з сяброўкай праходзіла праз утвораную арку. Гэты рытуал сімвалізаваў змену сацыяльнага статусу яго ўдзельнікаў. У старажытны час з кары бярозы выраблялі бяросту для пісьма.



## ВАСІЛЁК, валошка



**Травяністая расліна сямейства складанакветных, якая расце звычайна ў азімых пасевах і цвіце сінімі кветкамі.**

Васілёк адносіцца да нешматлікіх кветак, якія носяць мужчынскае імя. Вядома паданне, паводле якога ў кветку ператварыўся Васілёк, прыгожы хлопец з сінімі вачыма, якога заманілі ў жыта і загубілі русалкі. Васілёк даволі часта згадваецца ў песнях розных жанраў. Ён уключаны ў пералік кветак для вянка маладой.

У мастацкай літаратуры вобраз васілька неаднаразова выкарыстоўваў у сваёй творчасці Максім Багдановіч. У вершы «Слуцкія ткачыхі» гэта вобраз роднай старонкі:



І тчэ, забыўшыся, рука,
замест персідкага ўзора
цвяток радзімы васілька.




У апавяданні «Апокрыф» паэт параўноўваў кветку з чалавекам, які служыць мастацтву, у той час як колас забяспечвае матэрыяльныя патрэбы чалавецтва: «Добра быць коласам, але пашчасціла таму, хто нарадзіўся васільком».

Сёння васілёк — сапраўдны сімвал Беларусі. Ён выкарыстоўваецца, напрыклад, пры аздабленні ўпакоўкі з мэтай падкрэсліць беларускае паходжанне (напрыклад, скрыні для пасылак ад Белпошты). Васілёк змешчаны на лагатыпе Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску», а таксама з'яўляецца сімвалам кампаніі «Белавія».




Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь у 2012 годзе выпусціў памятную манету «Васілёк» у серыі «Кветкі Беларусі».



# ВІ́ШНЯ



**Род дрэвавых і кустовых раслін сямейства ружавых.**

У беларускім фальклоры аб'ядноўвае матывы нараджэння і пладнасці. У песнях шлюбна-любоўнай тэматыкі вішня абазначае дзяўчыну, якая дасягнула шлюбнага ўзросту.

У рамане «Людзі на балоце» Івана Мележа вішня — эстэтычны ідэал дзяўчыны: «Вішанька ад сонца красна, / Дзеванька ад бацькі слаўна»; «Як тая вішня, цвіла ў тое лета Ганна». Шчаслівае жыццё маладой дзяўчыны ў роднай матулі параўноўваецца з цвіценнем вішні ў садзе. Вішнёвы цвет, што апаў на галаву дзяўчыне, — сімвал яе гатоўнасці да шлюбу.

Апрача таго, вішня ўяўляецца сімвалам узаемнага кахання. Вішнёвы сад — сімвал роднага кутка замужніцы. Гулянне дзяўчыны ў ім асацыіруецца з яе вольным незамужнім станам. Калі гаворыцца пра вішнёвы сад у мужавай старане, гэта звычайна звязваецца са шчаслівым замужнім жыццём.

З 2012 года ў горадзе Глыбокае Віцебскай вобласці штогод праводзіцца «Вішнёвы фэст».





# ВЯРБА́

**Кустарнік або дрэва сямейства вярбовых з гнуткімі галінамі і вузкім лісцем.**

У народнай культуры беларусаў вярба мела дваістую характарыстыку. З аднаго боку, яна з'яўлялася сімвалам хуткага росту, урадлівасці, добрага здароўя. Да маладой вярбы ставіліся як да карыснага і свяшчэннага дрэва. На Вербніцу галінкі маладой вярбы неслі ў храм, каб асвяціць, затым прыносілі дадому і выконвалі з імі шэраг рытуальных дзеянняў, сімвалізуючых адраджэнне (ці зараджэнне) новага жыццёвага цыкла, здароўя і ўраджаю.

У паданнях і казках старая вярба, якая схілілася па-над вадою, лічылася прыстанішчам вадзянікоў, русалак і іншых «нячысцікаў». Беларусы лічылі: калі вярба вырасла да такіх памераў, што ў ёй стварылася дупло, там абавязкова паселіцца чорт са сваёй жонкай. У беларусаў існавала павер'е, што ранняй вясной чэрці залазяць на старую вярбу, каб пагрэцца. Пра тых, хто моцна закахаўся, казалі: «Улюбіўся, як чорт у сухую вярбу». Пры дапамозе лазы ці галінак вярбы на падворку адшуквалі ваду, каб выкапаць калодзеж.

# ДУБ



**Лістападнае дрэва сямейства букавых.**

Адно з самых шанаваных беларусамі дрэў, сімвал мужнасці. Самая важная якасць яго драўніны — выключная плотнасць, якая спрыяла доўгачасовай захаванасці, таму ствалы дуба пры будаўніцтве жытла выкарыстоўвалі для закладкі першага вянка — падрубы. Дуб лічыцца ўвасабленнем мужчынскага пачатку, таму гэтым словам могуць называць мужных і моцных хлопцаў (моцны, як дуб), а таксама неразумнага чалавека. Дубовыя гаі ў беларускай народнай культуры лічацца асаблівым, святым





месцам. На тэрыторыі Беларусі шануюцца таксама дубы, якія лічацца помнікамі прыроды або звязаны са знакамітымі асобамі. Напрыклад, Астанкавіцкія дубы-блізняты (Калінкавіцкі раён Гомельскай вобласці), Буда-Кашалёўскія дубы-волаты, Дуб Вацлава Ластоўскага (горад Полацк), Дуб-волат (Капыльскі раён Мінскай вобласці), Высокаўскі пірамідальны дуб (Камянецкі раён Брэсцкай вобласці), Пажэжынскі цар-дуб (Маларыцкі раён Брэсцкай вобласці), Дуб-трайнік (Зэльвенскі раён Гродзенскай вобласці), Туганавіцкія дубы-блізняты (Баранавіцкі раён Брэсцкай вобласці), Сахонаўскі дуб (Верхнядзвінскі раён Віцебскай вобласці), Цар-дуб (вёска Тадуліна Лепельскага раёна Віцебскай вобласці), Юсціянаўскі дуб-волат (Верхнядзвінскі раён Віцебскай вобласці). Апавяданне «Малады дубок» Якуба Коласа, прысвечанае маральным пакутам галоўнага героя за здзейсненае злачынства — спілаванне маладога дубка, лічыцца адным з найлепшых прыкладаў праяўлення псіхалагізму ў беларускай літаратуры.

# ЖУРАВІ́НЫ



**Ягадная вечназялёная расліна сямейства верасовых, што расце на мохавых балотах, а таксама ягады гэтай расліны.**

Беларуская назва блізкая да англійскай (англ. cranberry ад cran — журавель) і нямецкага дыялектнага слова (ням. Kronsbeere, Kranzbeere ад Kranich — журавель). Беларускі мовазнавец і фалькларыст Фёдар Янкоўскі тлумачыў журавіны як ягады на мохавых балотах, дзе вадзіліся журавы.

Збіраюць ягады з надыходам першых замаразкаў і да ўтварэння снежнага покрыва, а паўтараюць збор пасля раставання снегу. Збіраюць ягады ўручную або з дапамогай грабеньчыкаў.

Ягады журавін маюць вялікае гаспадарчае значэнне. Яны шырока выкарыстоўваюцца ў харчовай прамысловасці і медыцыне. Акрамя таго,





журавіны з'яўляюцца сезоннай ежай шматлікіх дзікіх жывёл і птушак. Ягады ідуць на прыгатаванне соусаў, дэсертаў (журавіны ў цукры), морсаў, сокаў, квасаў, кісялёў, якія ўяўляюць сабой добрую крыніцу карысных рэчываў і вітамінаў. Узвары і экстракты з журавін прыемныя і карысныя пры стоме. Лісце можа ўжывацца як гарбата. Асаблівасць ягад у тым, што яны могуць захоўвацца ў свежым выглядзе да наступнага ўраджаю ў драўляных бочках, напоўненых вадой.

Журавіны ў цукровай пудры з'яўляюцца традыцыйным прысмакам, які часта набываецца як сувенір з Беларусі.

З 2012 года праводзіцца штогодняе экалагічнае свята «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю» (Віцебская вобласць). Тут знаходзіцца балота Ельня — адно з найвялікшых балот Еўропы.





# ЖЫ́ТА

**Аднагадовая расліна сямейства злакаў, зерне якой выкарыстоўваецца для прыгатавання хлеба, а таксама зерне гэтай расліны.**

Слова «жыта» мае старажытныя карані. Даследчыкі лічаць, што словы «жыта» і «жыць» паходзяць ад аднаго кораня.

Ад жыта ўтварыліся многія беларускія прозвішчы — Жытко, Жыцько, Жыткоў, Жытковіч, Жыткевіч, Жыткоўскі; назвы рэк і азёр — Жыцінка; назвы гарадоў і вёсак — Жытнёў, Жытанежжа, Жыткавічы, Жытоўля, Жытаполле.

У беларускай міфалогіі існуе некалькі легендарных сюжэтаў пра з’яўленне жыта на зямлі.

З жытам звязаны беларускія міфічныя істоты. Жытняя баба ўяўлялася ў аблічы фантастычнай жанчыны з каласамі на галаве і зоркамі па баках. Жыцень, падобная да чалавека істота, уплывае на выспяванне ўраджаю.



У культуры беларусаў зерне сімвалізавала бессмяротнасць. Беражлівыя адносіны да хлеба выхоўвалі ў дзяцей з маленства. Кідаць хлеб заўсёды лічылася вялікім грахом. Непаважлівыя адносіны да хлеба былі недаравальнымі і вельмі строга караліся ў сям'і.

У беларусаў шмат прыказак і прымавак, фразеалагізмаў пра жыта: «Паміраць збірайся, а жыта сей», «Хто полю годзіць, у таго жыта родзіць», «Як жыта наліваецца, гаспадар умываецца».

Жыта выкарыстоўваецца ў шматлікіх абрадах. Напрыклад, традыцыя абсыпання жытам маладых на вяселлі, што садзейнічае багаццю і пладавітасці, існуе і сёння. Шырока бытаваў звычай пры пабудове дома класці паміж бярвеннем жыта.



# КАНЮШЫ́НА



**Кармавая травяністая расліна сямейства бабовых з трайчастым лісцем і шарападобнымі кветкамі.**

Выява канюшыны прысутнічае на гербе Рэспублікі Беларусь. Песня «Касіў Ясь канюшыну» ў выкананні вакальна-інструментальнага ансамбля «Песняры» з'яўляецца адной з самых вядомых і папулярных у Беларусі. Яна лічыцца народнай. Вядома беларуская прыказка: «Канюшына — каню сіла».





# ЛЁН

**Род кветкавых раслін сямейства лёнавых; прыродны матэрыял, які выкарыстоўваюць для пашыву адзення, зараз з'яўляецца гандлёвым брэндам Беларусі.**

Спрадвеку льняное палатно выконвала цэлы шэраг функцый, якія з цягам часу набылі значэнне сімвалічных. Ім накрывалі стол, у яго загортвалі хлеб, з яго рабілі мяшочак для клінковага сыру. Белы тэкстыль, найчасцей ільняны, адзначаў усе галоўныя моманты ў жыцці чалавека — нараджэнне, шлюб, а ў некаторых архаічных лакальных традыцыях і смерць. Ільняныя ручнікі ўпрыгожвалі хрысціянскія абразы.

Ільняныя абрусы, ручнікі, адзенне, пасцельная бялізна лічацца найлепшым сувенірам з Беларусі.

У беларускай мове існуе сталае параўнанне светлых валасоў з ільном — ільновалосы чалавек; часта ўжываюцца формы лянок (Алена Лянок — псеўданім паэтэсы), ляночак. Цёплае стаўленне да гэтай расліны адзначана ў многіх вершах.

# ШЫПШЫ́НА



**Кустовая расліна з буйнымі чырвонымі або ружовымі кветкамі і са сцяблом, якое пакрываюць калючкі; дзікарослы від ружы.**

Магчыма, атрымала назву за вострыя шыпы, якія пакрываюць яе галіны. З шыпшыны вараць варэнне, кісялі, яе сушаць, выкарыстоўваюць у медыцыне. Расліна з'яўляецца крыніцай вітамінаў, валодае супрацьзапаленчымі якасцямі. Усім беларусам добра вядомы радкі з верша Уладзіміра Дубоўкі:

О Беларусь, мая шыпшына,
зялёны ліст, чырвоны цвет!

У аповесці «Ладдзя роспачы» Уладзіміра Караткевіча галоўны герой Гервасій Выліваха ў памяць аб Радзіме прышпіліў да кашулі кветачку шыпшыны.



У беларускім фальклоры шыпшына можа сімвалізаваць боль, пакуты, варожасць. Так, у адной з песень адлюстроўваюцца думкі свякрові: «На сыну пасадзіла чырвону каліну... на маладой нявестцы — калючу шыпшыну...»

Але часцей яна сімвалізуе маладосць і каханне. У народным паданні апавядаецца, што ў куст з ружовымі кветкамі ператварылася маладая прыгожая дзяўчына, якая не хацела ісці замуж за багатага пана, бо кахала простага хлопца. Калі з куста паспрабавалі сарваць прыгожыя кветкі, яна выпусціла вострыя шыпы.

# ЖЫВЁЛЫ



## БУ́СЕЛ

**Вялікая пералётная птушка сямейства бусліных з доўгай прамой чырвонай дзюбай і чырвонымі нагамі.**

У розных мясцовасцях Беларусі бусла могуць называць бусял, бацян, бацьян, бусько, бусло, буцян, бусэнь, бусёк. Ад гэтага слова ўтвораны прозвішчы — Бацян, Боцька, Бацяноўскі, Бусько, Бусел, Буслаў, Бусловіч; назвы рэк і азёр — Бусль, Бусяж, Бусоўня; назвы вёсак — Буслаўка. Буськавай дарогай называюць Млечны Шлях.

Папулярны бусел у беларускай фразеалогіі: даўганогі (цыбаты), як бусел; мчыцца як той бусел з жабай; хутчэй бусел жарабя ўродзіць, калі ты ўгледзіш (адгадаеш); ходзіць як бусел па балоце; шыя доўгая як у бусла.

У беларускім фальклоры бусел паўстае як ахоўнік чалавечага жылля ад пажару, апякун над іншымі нябеснымі стыхіямі. Бусел — сімвал Радзімы, любові да роднай зямлі, роднага дому, сімвал дабрабыту:

І куды б ні пайшоў — застаюся
пад буслiным крылом Беларусі.
(Сяргей Законнікаў. «Тры аблiччы»)

Бусел таксама — сімвал дзетароднасці («Бусел дзіця прынёс»). Паводле беларускага павер'я бусел, які прысніўся, прадвяшчае цяжарнасць.

Пра паходжанне птушкі існуе некалькі легенд. Вось, напрыклад, адна з самых распаўсюджаных. Калі шмат развялося гадаў на зямлі і чалавек стаў цярпець ад іх шмат зла, Бог злітаваўся над чалавекам, забраў іх усіх у мех, завязаў і аддаў іх аднаму чалавеку, каб ён кінуў мех у печку, загадаўшы яму не глядзець, што завязана ў меху. Чалавек не ўцярпеў, развязаў мех, і ўсе гады адтуль выпаўзлі. За гэта Бог ператварыў непаслухмянага чалавека ў бусла, загадаўшы яму збіраць гадаў. Так ён і ходзіць па балотах, шукае жаб і змей.

У беларусаў існуе мноства прымет, абрадаў, звязаных з гэтай птушкай, па паводзінах бусла прадказвалі надвор'е.

Бусел быў і сярод калядоўшчыкаў, ён танцаваў, доўгай дзюбай біў гледачоў і ўсяляк смяшыў.



# ВОЎК



**Драпежная млекакормячая жывёла сямейства сабачых.**

У Беларусі трапляецца ўсюды. У старажытныя часы людзі надзялялі ваўка розумам. Лічылася, што калі з драпежнікам павітаешся першым, то ён ніколі цябе не кране. Час з лістапада па люты называлі воўчым, калі людзі маглі ператварацца ў ваўкоў.

Ваўка таксама лічылі сімвалам ночы і зімы, нават смерці. Для беларусаў вобраз ваўка з'яўляецца супярэчлівым. Сярод фразеалагізмаў можна сустрэць выразы «воўк у авечай шкуры», што азначае 'каварны, крывадушны чалавек', а таксама «біты воўк», што значыць 'вопытны, бывалы чалавек'. Сярод фразеалагізмаў, у якіх сустракаецца слова «воўк»: хоць ваўкоў ганяй — вельмі холадна; ваўком выць — горка скардзіцца; хоць воўк траву еш — абсалютна аднолькава, без розніцы.

У беларусаў ёсць прымаўкі, якія зафіксавалі павер'е пра ўспрыманне нечаканай сустрэчы з ваўком як добрага знака: «Калі воўк дарогу перабег — пашанцуе». Перабяганне дарогі ваўком можа разумецца як спатканне з продкам, што абяцае сваё апякунства.

Драпежнасць ваўка падкрэслена ў беларускіх прыказках і прымаўках: «Воўк казе не таварыш», «Воўк не пастух, казёл не агароднік», «Не за тое ваўка б'юць, што шэры, а што авечку з'еў». Частымі з'яўляюцца параўнанні з ваўком: баяцца як воўк ягняці, блішчаць як воўчае вока, галодны як воўк, глядзіш як воўк на казу.

# ЖА́БА



**Бясхвостая земнаводная жывёла сямейства сапраўдных жаб з бародаўчатай скурай; у шырокім сэнсе тэрмін «жаба» адносяць да ўсіх прадстаўнікоў атрада бясхвостых.**

У Беларусі распаўсюджаны 4 віды жаб. Жаба азёрная і жаба сажалкавая жывуць у вадзе ці каля яе. Жаба вастрамордая і жаба травяная жывуць на балотах і заліўных лугах, палянах, у садах, парках, каля жылля.

У дыялектах беларускай мовы жабу называюць рапухай, квактухай.

Жаба — пагардлівае, дакорлівае называнне дзяцей і падлеткаў (жаба малая) або жанчын (старая жаба). Памяншальна-ласкальная форма — жабка, дзіця жабы — жабяня, лічынкі жаб — апалонікі.

Вобраз жабы ў прыказках і прымаўках прыніжаны: «Каня куюць, а жаба ногі падстаўляе». Ён замацаваўся ў фразеалагізмах: пнецца як жаба на купіну —пішчом лезе куды-небудзь, каб дамагчыся чаго-небудзь; з жабіны прыгаршчы — чаго-небудзь вельмі мала; у сучасным выразе жаба душыць — калі чалавек шкадуе грошай, зайздросціць чужому поспеху. Жабай у каляіне могуць назваць асобу, якая робіць перашкоды якой-небудзь справе.

Крылаты выраз «жаба (жабка)-вандроўніца» ўвасоблены ў скульптуры ў горадзе Гродне. «Жабка» — таксама назва традыцыйнага танца на Палессі і Віцебшчыне.





# ЗМЯЯ́

**Паўзун з доўгім звілістым целам, без ног, звычайна з ядавітымі зубамі.**

На Беларусі распаўсюджаны тры віды змей — вуж, мядзянка, гадзюка звычайная. Для чалавека атрутнай з’яўляецца толькі гадзюка.

Як сцвярджае даследчык Уладзімір Конан, на тэрыторыі Беларусі, асабліва на Палессі, быў вельмі распаўсюджаны культ змей, найперш вужоў. Паводле беларускіх легенд, калі не крыўдзіць, паважаць мудрых вужоў, то яны прынясуць дабрабыт у хату. Калі чалавеку сустрэнецца вуж-цар у залатой кароне з рожкамі, то трэба рассцяліць перад ім пакрывала або ручнік з хлебам і соллю ды кланяцца Змяінаму Цару. Змей, перапаўзаючы палатно, скіне дабрадзею залаты ражок. Чалавек з такім падарункам робіцца мудрацом і знахарам.

Пра багатых ды шчаслівых гаспадароў беларусы кажуць: «Яму змей грошы носіць». Свяшчэнныя вужы жылі каля векавых дубоў — прытулкаў Перуна. Выявы вужоў і сёння сустракаюцца на вільчыках хат. У мастацкай літаратуры вобраз змяі згадваецца ў апавяданні «Вужыная карона» Яна Баршчэўскага, вершах «Змяіны Цар» Максіма Багдановіча, «Мой гаспадар Змяіны Цар» Анатоля Сыса і іншых творах.



# ЗУБР

**Дзікая млекакормячая жывёла сямейства пустарогіх; у пераносным значэнні слова «зубр» ужываюць, калі гавораць пра буйнога спецыяліста, уплывовую асобу ў якой-небудзь галіне дзейнасці.**

Зубр для беларускай культуры — знакавы звер. Яго нораў суадносны з беларускім нацыянальным характарам: бязмежная вынослівасць і цярплівасць урэшце можа змяніцца лютасцю, калі крыўдзіцель не знойдзе выратавання ад помсты. Самае вядомае мастацкае апісанне зубра — у паэме «Песня пра зубра» Міколы Гусоўскага (пераклад з лацінскай мовы Язэпа Семяжона):

Лютасцю больш небяспечны, чым люты драпежнік,
зубр для людзей не страшны, не чапай — не зачэпіць,
будзе стаяць як укопаны — пастыр на варце,
не страпянецца, а позіркам пасціць няспынна
і чараду, і сям'ю ў чарадзе на папасе.
Смелы, і ў гэтым няма яму роўнага звера
у свеце жывёльным пушчанскага нашага краю.

Да сярэдзіны XX стагоддзя зубр быў амаль вынішчаны, трапіў у Чырвоную кнігу Беларусі. Дзякуючы дзяржаўнай ахове і намаганням па захаванні папуляцыі сёння на тэрыторыі Беларусі налічваецца каля 2000 асобін, ім не пагражае выміранне. Большая частка зуброў жыве ў Белавежскай пушчы.



На чэмпіянаце свету па хакеі ў Беларусі ў 2014 годзе вобраз зубраняці быў выбраны афіцыйным талісманам. Выява зубра часта сустракаецца ў афармленні рэкламных матэрыялаў, якія прэзентуюць Беларусь.



# ЗЯЗЮ́ЛЯ

**Птушка сямейства зязюлевых, якая звычайна не ўе гнязда і кладзе яйкі ў чужыя гнёзды.**

Адна з найбольш міфалагізаваных птушак у традыцыйнай культуры беларусаў з ярка выяўленай жаночай сімволікай, звязанай з сумам, самотай, горам, разлукай, адзінотай, смерцю, светам памерлых.

У прыказцы «Начная зязюля дзённую перакукуе» ў вобразах дзённай і начной птушак выступаюць маці і жонка, і апошняя заўсёды пераважыць. Матыў ператварэння жанчыны ў зязюлю асабліва шырока выкарыстоўваецца ў баладах. Адным з самых распаўсюджаных з'яўляецца сюжэт пра пакрыўджаную маці, якой дзеці не падалі вады, калі яна захварэла, тады маці ператварылася ў зязюлю і адляцела з роднага дому.

Існуе традыцыя, пачуўшы кукаванне зязюлі ў лесе, падлічыць, колькі гадоў жыцця яна налічыць.

Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь выпушчана памятная манета «Легенда пра залатую зязюлю».





# МЯДЗВЕ́ДЗЬ

**Буйная драпежная млекакормячая жывёла сямейства мядзведзевых з густой поўсцю і тоўстымі нагамі.**

У славянскай міфалогіі з'яўляецца адным з самых шанаваных звяроў, татэмным знакам і абярэгам роду. У беларусаў існаваў культ гэтай жывёлы як гаспадара лесу і дзікай прыроды, як увасаблення язычніцкага бога Вялеса.

Асаблівае месца выяве жывёлы адводзіцца ў народным арнаменце. На ручніках сімвал жывёлы стаіць на межах двух бакоў тканіны як пачатак

і канец каляндарнага года. Адсюль з'явіліся вобразы веснавога і восеньскага мядзведзяў. Веснавое язычніцкае свята, прысвечанае культу жывёлы, называецца Камаедзіца (Камаёдзіца), яно адзначалася 24 сакавіка. У гэты дзень жанчыны варылі «камы» — гарохавую кашу — і выходзілі на ўскраіну вёскі, каб ад паху смачнай ежы мядзведзь хутчэй уставаў з бярлогі.

У многіх беларускіх паданнях жывёла і чалавек лічыліся сваякамі, існавала павер'е, што некалі ў мядзведзя быў ператвораны чалавек: яго лапы — як чалавечыя рукі; ён ходзіць на дзвюх нагах, мыецца, любіць мёд, клапоціцца пра сваіх дзяцей, разумее чалавечую мову.

У беларускім фальклоры існуе шмат казак, у якіх мядзведзь паўстае запаволеным, няўклюдным, даверлівым, непаваротлівым, а часам і дурнем. Мядзведзь таксама — беларуская страва з бульбы і цыбулі, часам з дадаdebugннем смятаны, сала, каўбасы і іншых інгрэдыентаў.

У часы Вялікага Княства Літоўскага папулярнай з'явай была дрэсіроўка мядзведзяў.



# МАТЧЫНА МОВА

# МОЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

## А́КАННЕ

**Выкарыстанне гука [а] у ненаціскным становішчы пасля цвёрдых зычных на месцы націскных галосных [о], [э] (во́дны — вада́).**

З'яўляецца нормай у беларускай мове, а таксама ўласціва для беларускіх гаворак. Самая ранняя з'ява акання зафіксавана ў старабеларускіх тэкстах XIV стагоддзя. Прычыны і час узнікнення акання ў беларусаў да канца не высветлены. На думку некаторых вучоных, аканне — балцкая дыялектная з'ява, якая трапіла ў беларускую мову ў перыяд яе фарміравання. Аднак аканне сустракаецца і ў гаворках іншых славян: балгар, славенцаў. Аканне і яканне — адметныя рысы фанетычнай сістэмы беларускай мовы.



# АПО́СТРАФ

**Надрадковы значок у выглядзе коскі.**

У розных арфаграфічных сістэмах мае рознае значэнне. У старабеларускім пісьменстве на месцы, дзе сёння пішацца апостраф, ужываліся адмысловы значок паерык або літары «ъ», «ь». Апостраф пачалі выкарыстоўваць як раздзяляльны знак пасля апублікавання ў 1918 годзе «Беларускай граматыкі для школ» Браніслава Тарашкевіча, аднак канчаткова яго функцыі вызначыліся толькі пасля рэформы правапісу ў 1926 годзе.

Сёння апостраф выконвае раздзяляльную функцыю перад галоснымі «е», «ё», «ю», «я», «і» пасля прыставак, якія канчаюцца на зычны (аб’езд, пад’ём), у сярэдзіне слоў пасля некаторых зычных (вераб’іны, куп’ё, саф’ян, д’ябал, сузор’е).

Апостраф таксама служыць для аддзялення часціц пры замежных прозвішчах і імёнах (О’Генры).

У Беларусі існуе літаратурная прэмія «Залаты апостраф», заснаваная ў 2004 годзе рэдакцыяй часопіса «Дзеяслоў».



# ДЗЕ́КАННЕ

**Чаргаванне цвёрдага гука [д] з мяккім [дз'], які вымаўляецца як адзін гук.**

Гэта рыса вымаўлення ўласціва беларусам і «выдае» іх пры размове на замежнай мове. У пачатку XX стагоддзя Яўхім Карскі адзначаў: «Праўда, маларосы [украінцы] не любяць тутэйшага дзекаючага вымаўлення, у сваіх кпінах з беларусаў яны падкрэсліваюць менавіта гэтую рысу: «хиба лихо озме литвина, щобъ винъ не дзекнувъ».

Дзеканне праявілася ў помніках пісьменства ўжо ў XV—XVI стагоддзях. У артыкуле «Праект літар для згукаў «дз» і «дж» Уладзімір Дубоўка прапанаваў увесці для іх асобныя літары, але гэта ідэя не была ўвасоблена ў жыццё.


Уладзімер ДУБОЎКА

ПРОЭКТ
ЛІТАР ДЛЯ ЗГУКАЎ
„ДЗ" і „ДЖ"

АДБІТАК З ЧАСОПІСІ
„УЗВЫШША" № 4 (10) за 1928 г.

МЕНСК



# КІРЫ́ЛІЦА

**Адна з дзвюх старажытных славянскіх азбук.**

Сваю назву атрымала ад імя славянскага асветніка Кірылы Філосафа (827—869). Створана ў IX стагоддзі на аснове грэка-візантыйскага пісьма. Паходжанне кірыліцы канчаткова не высветлена.




У XIV—XVIII стагоддзях кірыліца шырока ўжывалася ў беларускім пісьменстве. Спачатку ў старабеларускім пісьме ўжываліся ўсе літары кірыліцы, аднак у працэсе развіцця беларускай мовы многія літары сталі непатрэбнымі.

Выдатным дасягненнем стала стварэнне беларускім першадрукаром і асветнікам Францыскам Скарынам друкарскага варыянта алфавіта, які стаў узорам для іншых усходнеславянскіх друкароў. Сучасны беларускі алфавіт кірылічны, складаецца з 32 літар.



# КІТА́БЫ

**Кнігі, напісаныя на беларускай мове арабскім пісьмом.**

Ствараліся з XVI стагоддзя татарамі, якія пачалі сяліцца на тэрыторыі Беларусі пачынаючы з XIV стагоддзя, адны як ваеннапалонныя, другія — добраахвотна, у пошуках лепшага жыцця. Пэўны час яны захоўвалі свае традыцыі, культуру, мову. Паступова сталі далучацца да беларускай культуры, забылі татарскую і пераняlі беларускую мову. Для захавання рэлігіі татары вымушаны былі перакласці Каран і іншыя кнігі іслама на беларускую мову, пакінуўшы пры гэтым арабскі алфавіт. Звычайна кітабы змяшчалі ўсходнія легенды, казкі, прыгодніцкія аповесці, апісанні мусульманскіх рытуалаў.

Кітабы напісаны і чытаюцца справа налева. Радок суцэльны, няма падзелу на словы, няма вялікай літары і знакаў прыпынку. Мова кітабаў блізкая да беларускай народнай мовы. Цікава, што з дапамогай арабскай графікі больш дакладна ў параўнанні з кірыліцай перадаюцца некаторыя гукавыя асаблівасці беларускай мовы, у першую чаргу





дзеканне і цеканне, паколькі ў арабскай графіцы былі розныя літары для абазначэння парных гукаў.

Вывучэнне кітабаў пачалося ў XIX стагоддзі. Першаадкрывальнікам лічыцца прафесар Пецярбургскага ўніверсітэта ўсходазнавец Антон Мухлінскі. Вывучэнне кітабаў дае каштоўны матэрыял для філолагаў, этнографаў, фалькларыстаў, гісторыкаў, цюркологаў, арабістаў.

Кітабы зберагаюцца ў бібліятэках Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Акадэміі навук Літвы, Віленскага, Санкт-Пецярбургскага і Казанскага ўніверсітэтаў, у прыватных бібліятэках.



# КЛІ́ЧНЫ СКЛОН

**Асаблівая форма іменнай часціны мовы (часцей за ўсё назоўніка), якая выкарыстоўваецца для абазначэння аб'екта (часцей за ўсё адушаўлёнага), да якога звяртаюцца.**

Склонам гэта форма называецца ўмоўна. Гістарычна клічны склон уваходзіў у індаеўрапейскую сістэму склонаў і існаваў у санскрыце, старажытнагрэчаскай мове і латыні. Хоць пазней ён быў страчаны многімі сучаснымі індаеўрапейскімі мовамі, некаторыя мовы захоўваюць гэты склон і дагэтуль.

У беларускай літаратурнай мове гэты склон мае асобую форму ў назоўнікаў мужчынскага роду адзіночнага ліку (сват — сваце, брат — браце, сын — сыне, Янка — Янку, князь — княжа). У іншых выпадках клічны склон формай супадае з назоўным склонам (мама! сябры!). У беларускай літаратуры XIX стагоддзя, мова якой утваралася на аснове жывых гаворак, клічны склон зусім натуральны. Напрыклад, як у вершы Паўлюка Багрыма:

Зайграй, зайграй, хлопча малы,
...Дзе ж ты пойдзеш, небарача?

У літаратуры XX стагоддзя таксама сустракаецца выкарыстанне клічнага склону. Напрыклад, у рамане Івана Мележа «Людзі на балоце»: «Яна хацела, мусіць, паглядзецца ў ваду, але з хаты раптам пачуўся нездаволены крык: — Ганно-о! Дзе ты, нячыстая сіла?!»



# ЛАЦІ́НКА

**Назва варыянта лацінскага алфавіта, які выкарыстоўваецца для пісьма на беларускай мове.**

Беларуская лацінка грунтуецца на класічным лацінскім алфавіце з элементамі польскай і чэшскай графічных сістэм. У канцы XVI стагоддзя, пасля ўваходу Вялікага Княства Літоўскага ў склад Рэчы Паспалітай, сталі з'яўляцца першыя помнікі на лацінцы (захавалася невялікая колькасць дакументаў і надпісаў). З XVII стагоддзя лацінскі алфавіт выкарыстоўваўся ў тэатры. П'есы пісалі па-лацінску і па-польску, а беларуская мова гучала ў інтэрмедыях, якія забаўлялі гледачоў у антрактах.



Hod 1. Wilnia 10/23 listopada (nojabra) 1906 г. № 1

Nasza Niwa

PIERSZAJA BIEŁARUSKAJA HAZETA Z RYSUNKAMI

WYCHODZIC RAZ U TYDZIEŃ polskimi i ruskimi litera…

Cena asobnaho numeru 5…



Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

Год други. Вильня 4 (17) мая 1907 г. № 17.

Наша Нива

Першая Беларуская Газэта з Рысунками

Выходзиць раз у тыдзень рускими и польскими литэрами.

Адрэс рэдакции и администрации: Вильня, Завальная вулица, дом № 20.

РОДНАЙ СТАРОНЦЫ.

У XVI—XVII стагоддзях адбылося паступовае пашырэнне лацінскага пісьма ў беларускім справаводстве, а таксама ў свецкім і рэлігійным пісьменстве. Напрыклад, летапісны звод Хроніка Быхаўца, які першапачаткова быў напісаны кірыліцай, дайшоў да нашага часу ў лацінічным запісе XVIII стагоддзя.

Найбольш актыўна беларуская лацінка выкарыстоўвалася пісьменнікамі XIX стагоддзя, сярод якіх былі Паўлюк Багрым, Францішак Багушэвіч, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Ян Чачот і іншыя творцы. Сваю газету «Мужыцкая праўда» Кастусь Каліноўскі так-




сама выдаваў лацінкай. Нягледзячы на тое, што ў канцы XIX стагоддзя лацінка пачала паступова выцясняцца кірыліцай, у пачатку XX стагоддзя лацінкай былі надрукаваны зборнікі вершаў Цёткі «Скрыпка беларуская» і «Хрэст на свабоду» і Янкі Купалы «Гусляр». Газеты «Наша доля» і «Наша ніва» ў 1906—12 гадах выходзілі кірыліцай і лацінкай.

Сёння лацінку можна ўбачыць на некаторых картах, указальніках, а таксама ў назвах вуліц і схемах беларускага метрапалітэна.



# Лі́тара «Ў»



**Літара, якая абазначае адпаведны гук, што ўзнікае пасля галосных на месцы «в» і «л» перад зычнымі. Чытаецца як «у нескладовае» («у кароткае»).**

Літара ўнікальная, бо існуе толькі ў беларускай мове, аднак гук, які яна абазначае, у падобных пазіцыях сустракаецца ў іншых славянскіх мовах, напрыклад у славенскай і польскай, дзе перадаецца пры дапамозе іншых літар.

Упершыню ў сучаснай беларускай мове літара «ў» з'явілася ў лацінкавым варыянце ў XIX стагоддзі. Адным з пер-






шых яе ўжыў Ян Чачот у 1846 годзе ў вершаванай брашурцы «Да мілых мужычкоў». «Ў» сустракаецца таксама ў тэкстах Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Аднак толькі ў Францішка Багушэвіча яна набыла свой сучасны выгляд. Пазней з лацінкі яна трапіла ў беларускую кірыліцу. Прыкладна ў канцы першага дзесяцігоддзя XX стагоддзя літара «ў» пачала выкарыстоўвацца больш-менш паслядоўна.

У Полацку ўстаноўлены помнік унікальнай літары беларускага алфавіта.



# МАЎЛЕНЧЫ ЭТЫКЕТ

## «БЫВА́ЙЦЕ ЗДАРО́ВЫ», «Бывайце здаровы, жывіце багата»

**Беларуская застольная песня. Словы паэта Адама Русака, музыка Ісака Любана.**

Верш «Бывайце здаровы» быў напісаны ў 1936 годзе. Пэўны час песня лічылася народнай. У час Вялікай Айчыннай вайны гучала на франтах, мела вялікае значэнне ў мабілізацыі сіл беларускага народа на адпор ворагу. Тэкст меў мноства варыянтаў, якія складалі франтавікі, партызаны, грамадзянскае насельніцтва. Выконвалася народнай артысткай БССР Ларысай Александроўскай, народным артыстам СССР Леанідам Уцёсавым. Сярод пазнейшых выканаўцаў — ансамбль «Песняры» пад кіраўніцтвам Уладзіміра Мулявіна, Іосіф Кабзон, Зміцер Вайцюшкевіч.

Тэкст песні:
Бывайце здаровы,
жывіце багата,
ужо ж мы паедзем
да сваёй хаты.
Ў зялёнай дубраве
мы начаваць будзем.
Эх! Вашае ласкі
вавек не забудзем.
У вашым калгасе
шырокае поле,
няхай жа на шчасце
цвіце ваша доля.

На рэчках на вашых
бурлілі бы воды,
каб плавалі з крыкам
гусей карагоды.
Каб жыта у полі
трубою вілося,



каб сала у хаце
кублами вялося.
Штодзень у капусце
каб плавала скварка,
а к скварцы часінай
вялася б і чарка.

Яшчэ вам жадаем
прыбытку у хаце —
не мала, не многа —
штогод па дзіцяці.
Не будзе вам крыўды
яшчэ і за тое,
калі пашанцуе
на год і па двое.

Бывайце здаровы,
жывіце багата,
а мы ад'язджаем
дадому, дахаты.





# БЯСЕ́ДА

**Збор гасцей (родных, суседзяў, блізкіх знаёмых) з нагоды сямейнай урачыстасці.**

Слова агульнаславянскага паходжання, але можа адрозніваецца значэннем у розных мовах, напрыклад, у рускай мове «беседа» — размова, гутарка.

«Бяседай» названы ансамбль народнай музыкі, сядзіба ў Віцебскай вобласці, фестывалі беларускай культуры — «Прымацкая бяседа» і «Сяброўская бяседа». Слова часта выкарыстоўваецца ў беларускай літаратуры:

Калі бяседа будзіць мілыя ўспаміны,
дык момантам здадуцца вечара гадзіны.
Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч

Помніць свой на іржышчы цень,
не забыць, як завуць суседа,
не забыць, як пяе пад дзень
за вясёлым сталом бяседа.
Рыгор Барадулін



# ДЗЯ́КУЙ




**Зварот ветлівасці, які выражае ўдзячнасць.**

Мае агульнаіндаеўрапейскае паходжанне (параўнайце з польскім «dzięki», нямецкім «danken»).

Сінанімічнымі да слова «дзякуй» з'яўляюцца звароты «дазволь выказаць маю ўдзячнасць!», «прымі, калі ласка, падзяку за...», «шчыры дзякуй!», «шчыра ўдзячны/ўдзячная!».

Сёння слова ўжываецца ў назвах крам (крама дызайнерскіх падарункаў і сувеніраў «Вялікі дзякуй»), мабільнага дадатку («Дзякуй» — сэрвіс для аплаты паліва і кавы на запраўках А-100), дабрачынных акцый (анлайн-аўкцыён беларускіх мастакоў «Дзякуй»).

У адказ на падзяку ў залежнасці ад сітуацыі можна адказаць: «Няма за што!», «На здароўе!», «Спажывайце на здароўе!», «На спажытак Вам!».

Існуе меркаванне, што «дзякуй» — адно з найбольш адметных слоў беларускай мовы.





## **ЖАРТ**, анекдот, паказка

**Адзін з самых папулярных фалькларных празаічных жанраў малой формы.**

Анекдот высмейвае не толькі сацыяльныя з'явы, але і крытыкуе людскія заганы, учынкі, сямейна-бытавыя здарэнні, з'яўляецца сродкам самакрытыкі. Першым апублікаваным зборнікам сатырыка-гумарыстычных твораў малых форм з'яўляецца невялікі выпуск «Беларускія жарты», апублікаваны ў 1915 годзе Вацлавам Ластоўскім як дадатак да беларускіх выданняў. Асобнымі выданнямі выйшлі ў свет зборнікі анекдотаў і жартаў «Народныя ўсмешкі» (1961 год), «Беларускія народныя жарты» (1970 год), складзеныя Змятром Бяспалавым; «Жарты, анекдоты, гумарэскі» (том з серыі «Беларуская народная творчасць», 1984 год). 44 анекдоты апублікаваў Ніл Гілевіч у зборніку «Народныя казкі-байкі, апавяданні і мудраслоўі» (1983 год), вядома кніга жартаў «Дуліна ад Барадуліна» Рыгора Барадуліна (2004 год). Шмат анекдотаў і жартаў друкуецца ў газетах і часопісах («Звязда», «Вожык» і іншыя выданні). Як адзначаў Уладзімір Караткевіч, беларусам асабліва характэрна пачуццё гумару і самаіроніі.

# ІМЯ́

**Асабістая назва чалавека, якая даецца яму пры нараджэнні.**

Беларуская іменная мадэль складаецца з асабістага імя, імя па бацьку і прозвішча. Беларускія імёны па паходжанні неаднародныя. Сярод іх сустракаюцца старажытнагрэчаскага, старажытнаяўрэйскага, лацінскага, славянскага паходжання. Для беларускай мовы ўласцівы народны іменнік, у якім няма адной строга замацаванай формы (напрыклад, Юрась, Юрок, Юрка, Юры, а не толькі Юрый). Некаторыя формы імёнаў у беларускай мове адрозніваюцца ад такіх самых у рускай мове: Мікола, Апанас, Мікіта, Генадзь.

Імя па бацьку ўжываецца ў рускіх, украінцаў і беларусаў. Гэта вельмі старажытная традыцыя, якая ўказвала на паходжанне ад пэўнага пачынальніка роду па лініі бацькі або дзеда. Яно дадаецца да імя, каб падкрэсліць павагу да асобы, звычайна дарослага чалавека. На думку некаторых анамастаў (навукоўцаў, якія сярод іншага вывучаюць асабістыя імёны, назвы рэк, азёр, гарадоў), у беларусаў не было даўняй традыцыі выкарыстоўваць імя па бацьку. Разам з тым існуюць цікавыя самабытныя беларускія формы звароту да старэйшага пакалення — дзядзька Рыгор, цётка Мар'я. Не маюць аналагаў у іншых мовах адыменныя словы, утвораныя са значэннем «жонка каго-небудзь» (Лявоніха, бандарыха, каваліха) або «дачка каго-небудзь» (князёўна, кавалёўна, бандароўна).

Адным з першых збораў беларускіх імёнаў стаў выдадзены ў 1923 годзе Вацлавам Ластоўскім «Крыўскі (беларускі) іменнік».




Яўген

# КАЛІ́ ЛА́СКА!




**Зварот ветлівасці, які ўжываецца ў адказ на падзяку або пры просьбе.**

Гэты маўленчы зварот у аднайменным вершы Петруся Броўкі паказаны як адно з самых мілагучных слоў прыгожай беларускай мовы і як сведчанне добразычлівасці і гасціннасці беларусаў:

У любімай мове, роднай, наскай,
ах, якія словы: «Калі ласка!..»
Як звіняць яны сардэчнаю струною,
праз усё жыццё ідуць са мною.
Трапіць госць у будзень, а ці ў свята:
— Калі ласка, калі ласка, ў хату!

Словазлучэнне актыўна выкарыстоўваецца ў назвах прамысловых тавараў (гарбата Kali Laska), дабрачынных праектаў, банкаўскіх паслуг, прадпрыемстваў грамадскага харчавання.



# МАЎЛЕ́НЧЫ ЭТЫКЕ́Т

**Сістэма ўстойлівых формул зносін, прынятых у грамадстве.**

Маўленчы этыкет выступае як форма выражэння ветлівасці, паважлівых, добразычлівых адносін да субяседніка. Этыкетныя маўленчыя формулы выкарыстоўваюцца ў сітуацыях:

- знаёмства, звароту (таварыш, спадар, пан, пані, панове),
- прывітання (добры дзень! добрай раніцы! дабранач! вітаю!),
- развітання (усяго добрага! да сустрэчы! да пабачэння!),
- пры выражэнні падзякі (дзякуй! дзякую вам! вельмі ўдзячны вам! шчыры дзякуй!),
- пажадання (смачна есці! бог у помач! спору ў працы! вялікі расці!),
- прабачэння (выбачайце! прабачце, калі ласка!),
- просьбы (будзьце ласкавы! калі ласка!),
- запрашэння, парады (сардэчна запрашаем!).






Важнасць ведання этыкету падкрэсліваецца ў беларускай прыказцы «Як развітаешся, так і прывітаешся».

У маўленчым этыкеце кожнага народа праяўляецца яго нацыянальная спецыфіка, адметнасць ладу жыцця, менталітэту, звычаі і традыцыі. Напрыклад, у беларусаў не было прынята моўчкі праходзіць каля чалавека, які працуе, вудзіць рыбу ці займаецца нечым іншым. Было прынята адмыслова павітацца: «Памагай божа!», «Рыбно вам!», «Грыбно вам!». На гэта прынята ветліва адказаць: «Дзякуй!»

У выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» выйшла кніга «Этыкет па-беларуску» Сяргея Зелянко, якая ў займальнай форме знаёміць чытачоў з маўленчай культурай беларусаў.





# ПРО́ЗВІШЧА

**Спадчыннае радавое імя, якое ўказвае на прыналежнасць чалавека да пэўнага роду, сям'і.**

У беларускай мове, як і ў некаторых іншых славянскіх мовах, жаночыя прозвішчы, як правіла, адрозніваюцца па форме ад мужчынскіх (Іванова — Іваноў). Дзявочае прозвішча — прозвішча, якое замужняя жанчына насіла да ўступлення ў шлюб. Беларускія прозвішчы могуць быць утвораны ад імёнаў (Іваноў, Пятроў) альбо паходзіць ад назвы дзейнасці той ці іншай сям'і (Півавар, Кавальчук, Бондар), мясцовасці (Белазёрскі), мянушак і дахрысціянскіх імёнаў (Кульгавы, Траццяк, Пазняк). Прозвішчы, якія паходзяць ад імя продка, называюць патранімічнымі. Большасць з іх у беларусаў маюць суфікс -іч (Міцкевіч, Козіч, Дашкевіч). Да групы патранімічных прозвішчаў, найбольшай і найстаражытнейшай, таксама адносяцца тыя, што заканчваюцца на -ук (-юк), -эня (-еня), -энка.

Па сведчанні вучоных, у канцы XV стагоддзя прозвішчы мелі вышэйшыя саслоўі — баяры, шляхта. Сяляне займелі прозвішчы пасля аграрнай рэформы XVI стагоддзя.

# ПРЫ́КАЗКА

**Жанр народнай вуснай творчасці, які ва ўстойлівым выразе-афарызме абагульняе жыццёвы вопыт народа, дае практычныя парады і павучанні.**

Прыказка нараджаецца ў канкрэтнай жыццёвай сітуацыі, самастойна не бытуе, выкарыстоўваецца ў маўленні ў патрэбны момант. Яна канкрэтызуе сітуацыю, засяроджвае на ёй увагу, робіць высновы: «Хто ілжэ, той і крадзе» або «Хто дбае, той і мае». У некаторых прыказках у некалькіх словах заключаецца дзеянне і яго вынік: «Баба з воза — каню лягчэй».

Вельмі шырока ўжываецца ў прыказках схаванае параўнанне («Бацька нажываў горбам, а дзеткі пражылі горлам»). Многія прыказкі пабудаваны на супрацьпастаўленні («Паны балююць, а мужыкі гаруюць»).

Прыказка — народная памяць пра мінулае і яскравы зварот да сучаснага, вобразнае адлюстраванне нацыянальных адметнасцей народа.



# ПРЫ́МАЎКА




**Слоўны выраз, які падкрэслівае якую-небудзь характэрную прыкмету з'явы без абагульненняў і вывадаў з іншых падобных сітуацый або чалавечых паводзін.**

Калі прыказка з'яўляецца закончаным меркаваннем, «замкнутым» выразам, то прымаўка ўспрымаецца незакончанай думкай, патрабуе завершанасці.

Выкарыстоўваецца толькі ў канкрэтных выпадках, каб падкрэсліць пэўную рысу чалавека, яго ўчынак, раскрыць сутнасць грамадскай або прыроднай з'явы. Сярод беларускіх прымавак: «На языку мядок, а на сэрцы лядок» (пра двудушнага чалавека), «Не з тваім ротам мышэй лавіць» (пра няўмеку), «Ні млеў, ні пацеў, а рот разявіў» (пра гультая), «Пальца ў рот не кладзі» (пра кемлівага).

Многія прымаўкі перадаюць розныя прыкметы, парады, правілы этыкету: «Снег на куццю — грыбы на лета», «Посуд б'ецца на шчасце».



## ПРЫПЕ́ЎКА

**Невялікі, звычайна чатырохрадковы песенны твор лірычнага ці гумарыстычнага характару.**

Верагодна, прыпеўка ўзнікла ў старажытнасці і доўгі час існавала разам з музыкай і танцам, потым, аддзяліўшыся ад танца, вылучылася ў самастойны жанр.

На тэрыторыі Беларусі як жанр сфарміравалася ў другой палове XIX стагоддзя, у 1920-я гады атрымала шырокае распаўсюджанне. Характэрнай асаблівасцю прыпеўкі з'яўляецца незамацаванасць тэксту за пэўнай мелодыяй. У розных мясцовасцях адзін і той жа тэкст кладзецца на розныя напевы. У той жа час на асобныя напевы маглі спявацца дзясяткі розных тэкстаў.

Выкананне прыпевак — свайго роду спаборніцтва, слоўная імправізацыя выканаўцы, пры якой музы́ка (гарманіст, баяніст) становіцца актыўным яе ўдзельнікам.

Сёння прыпеўкі — вельмі папулярны ў народзе жанр традыцыйнай творчасці. Яны працягваюць існаванне ў розных галінах мастацкай культуры народа, асабліва ў аматарскай дзейнасці.





**ФАЛЬКЛО́Р**, вусная народная творчасць, народная паэтычная творчасць

**Від мастацкай творчасці народа, што адлюстроўвае рэчаіснасць у паэтычных вобразах; важная частка духоўнай культуры беларусаў.**

Да фальклору адносяцца апавядальныя жанры, песні, абрадавая паэзія, малыя жанры, народны тэатр, дзіцячы фальклор, інструментальная музыка, народныя танцы.

На працягу стагоддзяў у фальклоры адлюстроўваліся змены, гістарычнае развіццё побыту, светапогляду, сацыяльных стасункаў, каштоўнасцей яго стваральнікаў.




Беларускі фальклор з'яўляецца адным з найлепш апісаных у Еўропе. У XX стагоддзі выдадзена больш за 50 тамоў серыі «Беларуская народная творчасць», у якой сістэматызаваны ўсе жанры фальклору (тамы «Каляндарна-абрадавая паэзія», «Сямейна-абрадавая паэзія», «Прыказкі і прымаўкі», «Прыпеўкі»).

Важным набыткам беларускай фалькларыстыкі XXI стагоддзя з'яўляецца двухтомная энцыклапедыя «Беларускі фальклор». Фальклор мае цесныя сувязі з рознымі відамі мастацтва — літаратурай, жывапісам, музыкай, тэатрам. Фальклор часта называюць «мастацкім летапісам народа», «важнейшай часткай духоўнай культуры народа».



# З СІВЫХ ЛЕГЕНД...

## АСІ́ЛАК

**Герой традыцыйных беларускіх чарадзейных казак, легенд і паданняў.**



Воін незвычайнай сілы (вырывае з каранямі дрэвы, кідае каменныя глыбы), мужнасці і розуму, пры гэтым справядлівы, спагадлівы, здольны спачуваць і заўсёды гатовы дапамагчы і абараніць пакрыўджанага. Неймаверная моц асілкаў тлумачыцца іх дзівосным нараджэннем. Напрыклад, Кацігарошак (Пакацігарошак) нарадзіўся ад жанчыны, якая з'ела незвычайную гарошыну; ад ветру нарадзіўся Іван Падвей, ад мядзведзя і вясковай жанчыны — Івашка — мядзведжае вушка.

У асобе Асілка спалучаюцца шматлікія рысы станоўчых казачных герояў. Смеласць і сіла зближаюць яго з былиннымі багатырамі і волатамі.



# БАРЫ́САВЫ КАМЯНІ́



**Манументальныя помнікі эпіграфікі XII стагоддзя.**

На тэрыторыі Беларусі вядомы сем вялікіх валуноў з высечанымі на іх крыжамі і надпісамі «Господи помози рабу своему». Назву атрымалі ад імя полацкага князя Рагвалода Усяславіча (канец 1040-х гадоў — 1128). Першы, хто звярнуў увагу на адзін з Барысавых камянёў, быў гісторык Мацей Стрыйкоўскі, які жыў у Віцебску ў другой палове XVI стагоддзя. Захаваліся тры з пяці камянёў: у горадзе Полацку каля Сафійскага сабора (раней знаходзіўся каля вёскі Падкасцельцы); у гарадскім пасёлку Друя Браслаўскага раёна на Цэнтральнай плошчы (раней знаходзіўся на беразе Заходняй Дзвіны); у Маскве ў музеі-запаведніку «Каломенскае» (адзін з дзісенскіх з-пад вёскі Балоткі, з надпісам «Сулиборъ хръст»). Магчыма, у старажытнасці да прыняцця хрысціянства Барысавы камяні былі язычніцкімі аб'ектамі пакланення. У савецкі час у перыяд барацьбы з рэлігіяй яны знішчаліся.

У народзе гэтыя камяні называліся Барыс, Барыс-Хлебнік, Барыс-Глеб, Барысаглебскі, Пісар, Пісанік.





# ВАЛАТО́ЎКА

**Узвышанае месца, у якім, паводле народных уяўленняў беларусаў, пахаваны легендарныя асілкі-волаты; курган.**

Слова ўтварылася ад слова «волат» (асілак) і не мае адпаведніка ў рускай мове. Адлюстроўвае ўзаемасувязь ландшафту Беларусі і міфалогіі беларускага народа. У вершы «Валатоўкі» Петруся Броўкі ёсць такія радкі:

Як восенню ўзгоркі засцелюцца золатам,
паміж валатовак блукаць я люблю, —
а ў тых валатоўках волаты, волаты,
што леглі калісьці за нашу зямлю.

# ВЯСЁЛКА




**Шматколерная дугападобная паласа на небе, якая ўзнікае ад праламлення сонечных праменняў у кроплях дажджу.**

Назву «вясёлка» таксама маюць расліна, грыб, бярэзнік з павіслых бяроз.

У дыялектах беларускай мовы варыянтамі слова «вясёлка» з'яўляюцца: радуга, радуха, тэнч(а), асёлка, весялуха, каромісіл, цмок, дуга. Вясёлку называюць таксама «нябесным дзіўным мостам», «шматколернай дарожкай». Вясёлку ў народзе ўспрымалі як лук Перуна, з якога гравержац пасылае на зямлю стрэлы — маланкі. Па асаблівасцях вясёлкі і часе яе ўзнікнення на небе прадказвалі будучае надвор'е. Паслядоўнасць колераў вясёлкі — чырвоны, аранжавы (або памаранчавы), жоўты, зялёны, блакітны, сіні, фіялетавы — лёгка запомніць, карыстаючыся наступнымі сказамі, у якіх першая літара кожнага слова з'яўляецца першай літарай у назве колеру: «Чакаю апетытных жабак з беларускіх сажалак. Француз»; «Чыж аддаў жуку загад: брат, схавай фотаапарат»; «Чэшскі пан жадае зноў бачыць сорак фазаноў»; «Чаму птах журботны зранку? Бо сапсута філіжанка».

Назву «Вясёлка» мае беларускі дзіцячы часопіс.



# КО́ЛЕР

**Светлавы тон чаго-небудзь; афарбоўка.**



Колер у культуры беларусаў адыгрывае сімвалічную ролю. У беларускай міфалогіі, фальклоры, этнаграфіі, паводле даследаванняў, існуе тры асноўныя (белы, чырвоны, чорны — універсальная колеравая трыяда) і чатыры дадатковыя (жоўты, зялёны, сіні і шэры) колеры. У адзенні беларусаў звычайна пераважалі два колеры — белы і чырвоны.

Асэнсаванню ролі колеру ў беларускай культуры прысвечана кніга «Колер Беларусі» Міхала Анемпадыстава (2017 год).



**ЗЯЛЁНЫ — адзін з трох асноўных колераў, шырока распаўсюджаны ў жывой прыродзе.**

Большасць раслін зялёнага колеру, бо ўтрымліваюць пігмент фотасінтэзу — хларафіл. Зялёны як сігнальны колер — прыкмета бяспекі, дазволенасці дзеяння, руху (светлафор). Зялёны колер (колер травы, раслін) супакойвае нервовую сістэму. Ён лічыцца колерам паветра. Выкарыстоўваецца як адзін з асноўных колераў на сцягу Рэспублікі Беларусь.

**БЕЛЫ — самы светлы колер у колеравай гаме, яднанне ўсіх колераў.**

Слова паходзіць ад праславянскага bělъ. Беларусь — адна з нешматлікіх краін, у назве якіх прысутнічае колер. Існуе шмат поглядаў адносна паходжання назвы нашай краіны. Самы распаўсюджаны з іх тлумачыць яе сэнс тым, што большасць жыхароў нашага краю ў мінулым мелі светлы колер валасоў і насілі светлую вопратку. Існуе таксама думка, што эпітэт «белая» азначае ‘вольная, незалежная’: адны пад Белай Руссю разумелі зямлю, не заваяваную татарамі, свабодную ад мангола-татарскага нашэсця, другія — Русь хрышчоную. Але да канца гэта пытанне вучонымі пакуль не вырашана.

У Беларусі шмат «белых» назваў рэк, азёр, крыніц, балот, лясоў, паселішчаў. Белымі завуцца балоты, парослыя белай пушыцай, белым мохам, падвеем, нізкім беразняком, а таксама лугі, на якіх расце дзікая дзяцеліна з дробнымі белымі кветкамі, бярозавыя гаі і пясчаныя пагоркі. Вядомы 43 возеры пад назвай Белае, чатыры ракі — Белая і мноства іншых — тыпу Беліца, Белічанка, Беларэч. Некаторыя назвы паселішчаў узніклі ад назваў рэк і азёр: вёска Белая ва Ушацкім раёне размешчана каля возера Белага.

У XVI—XVII стагоддзях на беларускіх землях з'явіліся назвы Белы Двор, Белы Дворак, Белае Сяльцо, Белы Засценак. Белымі ў гэты перыяд называліся паселішчы на землях «белага духавенства», на землях, вызваленых ад



падаткаў, а таксама на панскіх землях. У геральдыцы белы колер сімвалізуе святло, высакароднасць, вышэйшую ўладу, свабоду. Існуюць формы бялюткі, бялюсенькі, якія падкрэсліваюць чысціню і белізну пэўнай з'явы.

**ЧЫРВОНЫ — адзін з асноўных колераў спектра, што ідзе перад аранжавым; колер крыві.**

У народнай мове і паэзіі выкарыстоўваецца для абазначэння чагосьці прыгожага, яснага, светлага. Верагодна, слова ўтварылася ад дзеепрыметніка «черъвлены», што значыць 'афарбаваны ў чырвоны колер'. Чырвоны можа сімвалізаваць пладавітасць, жыццё, кроў, агонь, узнаўленне, здароўе, ваяўнічасць, а таксама крывавую небяспеку, парушэнне гармоніі, смерць і яе пераадоленне, а таксама абазначаць агонь, мужнасць, смеласць у бітве.

Спалучэнне белага і чырвонага колераў можна ўбачыць ва ўзорах беларускіх ручнікоў, у народных строях. Чырвоны колер быў «на шчытах і рызах», на харугвах Вялікага Княства Літоўскага, дамінуе на Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь.

На тэрыторыі Беларусі распаўсюджаны назвы з часткай «чырвоны»: Чырвоная Горка, Чырвоны Гарадок, Чырвоны Камень, Чырвоны Курган, Чырвоная Паляна, Чырвонае Поле, Чырвоны Рог, Чырвоны Бераг, Чырвоны Бор, Чырвоная Гара.



# КРЫЖ

**Фігура з дзвюх ці больш ліній, якія перасякаюцца найчасцей пад прамым вуглом; важны хрысціянскі сімвал.**

Самы знакаміты крыж Беларусі — Крыж Ефрасінні Полацкай, загадкавая гісторыя знікнення якога і сёння з'яўляецца аб'ектам цікаўнасці многіх даследчыкаў. Святыня была выраблена па замове Ефрасінні Полацкай мясцовым майстрам-ювелірам Лазарам Богшам у 1161 годзе і з'яўлялася каўчэгам для захавання хрысціянскіх рэліквій. Шасціканцовы крыж быў вышынёй 52 сантыметры, даўжынёй верхняй папярочкі — 12 сантыметраў, ніжняй — 21 сантыметр, таўшчынёй 2,5 сантыметра. Аснова крыжа — кіпарысавае дрэва, пакрытае золатам з каштоўнымі камянямі. Крыж захоўваўся ў царкве Святога Спаса ў Полацку да пачатку XIII стагоддзя, пасля быў перавезены ў Смаленск, адтуль у 1514 годзе Іванам Грозным у Маскву, аднак быў








вернуты на радзіму з-за надпісу на крыжы з пагрозай пракляцця таму, хто вывезе рэліквію з Полацка. Падчас вайны 1812 года крыж быў схаваны ў сцяне Сафійскага сабора ў замураванай нішы, а ў 1841 годзе вернуты ў храм Святога Спаса. У 1921 годзе святыню канфіскавалі савецкія ўлады. Крыж канчаткова згублены ў 1941 годзе падчас адступлення Чырвонай Арміі з Магілёва, дзе ён захоўваўся ў музейнай калекцыі. Пасляваенныя пошукі крыжа былі беспаспяховымі. У 1997 годзе брэсцкі майстар Мікалай Кузьміч зрабіў дакладную копію крыжа, якая захоўваецца ў Полацку ў царкве Ефрасінні Полацкай.

У 2021 годзе, на Вялікдзень кафедральнаму сабору святацеляў Кірылы і Лаўрэнція Тураўскіх у горадзе Тураве была падаравана ўзноўленая святыня — напрастольны Тураўскі крыж, што быў страчаны. Па сярэдневяковых тэхналогіях былі выраблены два аднолькавыя крыжы — для Тураўскай епархіі і для Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (куратар праекта — Марыя Нецвятаева, аўтар эскізнага праекта — мастачка Алена Андрушчанка, ювелір — Алег Ермаловіч).



# КУРГÁН

**Высокі старадаўні магільны насып.**

Беларускі даследчык Адам Кіркор у працы «Жывапісная Расія» так вызначыў каларыт беларускай мясцовасці: «Беларусь — край магіл, курганоў, гарадзішч, гарадкоў, урочышч, замкаў, замчышч — край, дзе амаль не на кожным кроку вы сустракаеце сляды мінулага, у помніках, сказаннях, песнях». Адна з паэм Янкі Купалы мае назву «Курган»:

Паміж пустак, балот беларускай зямлі,
на ўзбярэжжы ракі шумнацечнай,
дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі, —
ўдзірванелы курган векавечны...

Якуб Колас у адным са сваіх вершаў пісаў:

...Чым так прыкованы я  
к вам, мае ўзгорачкі роднага поля,  
рэчкі, курганы, лясы,  
поўныя смутку і жальбы нядолі,  
поўныя сумнай красы?

У цяперашні час узводзяцца курганы з мемарыяльнымі, архітэктурнымі ці скульптурнымі збудаваннямі, што ўвекавечваюць памяць землякоў, якія загінулі ў барацьбе з ворагам у Вялікую Айчынную вайну. Адным з найбуйнейшых помнікаў ахвярам Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі з'яўляецца Курган Славы пад Мінскам.






# МЛЕ́ЧНЫ ШЛЯХ

**Гіганцкая зорная сістэма, якая на начным небасхіле бачыцца белай паласой.**

У беларускай мове засведчаны іншыя назвы: Птушыная Дарога, Дарога Птушкам або Дарога ў Вырай, Божая Дарога, Зорны Шлях, Дарога ў Рым (Іерусалім, Кіеў). Сустракаецца, як ва Украіне, і назва Чумацкі Шлях — зоркі паказвалі дарогу чумакам, якія хадзілі ў Крым па соль.

Слова «млечны» не характэрна для беларускай мовы, аднак замацавалася ў назве, запазычанай са старажытнагрэчаскай міфалогіі.

Візітнай карткай Нясвіжа і Нясвіжскага раёна з'яўляецца народны ансамбль песні «Млечны шлях», створаны ў 1988 годзе. У 2000 годзе за творчае развіццё і актыўную творчую дзейнасць ансамблю прысвоена званне «Народны калектыў Рэспублікі Беларусь».

Пісьменнік Кузьма Чорны напісаў раман «Млечны Шлях». У творы Млечны Шлях выступае сімвалам вяртання на радзіму людзей, якія праз ваенныя абставіны аказаліся па-за яе межамі. Млечны Шлях апеты ў творах Янкі Купалы.



# НЕ́СЦЕРКА




**Несцерка — селянін-бядняк, дасціпны жартаўнік, здольны не толькі абараніць сябе, але і пакінуць у дурнях сваіх праціўнікаў або суразмоўцаў.**

Несцерка з'яўляецца героем аднайменнай п'есы Віталя Вольскага, напісанай у 1940 годзе і пастаўленай у 1941 годзе Беларускім другім дзяржаўным тэатрам. У 1955 годзе п'еса была экранізавана. Сюжэт уяўляе сабой шэраг займальных прыгод, якія здараюцца з галоўнымі персанажамі. Галоўны герой, селянін Несцерка, жадае дапамагчы хлопцу Юрасю ажаніцца з дзяўчынай Насцяй. Дзеля гэтага яму даводзіцца пераадолець нямала перашкод: абхітрыць пана, перамагчы ў спрэчцы шкаляра, ашукаць суддзю, а таксама прымусіць шкаляра адмовіцца ад шлюбу. У 1980 годзе рэжысёр Яўген Ларчанка стварыў мультфільм «Несцерка», у 2013 годзе рэжысёр Ігар Волчак — поўнаметражны мультфільм «Прыгоды Несцеркі».

Імя «Несцерка» прысутнічае ў назве кніжнай крамы ў Шчучыне, кафэ ў Нясвіжы, назвах хлеба і пірагоў.



# ПА́ПАРАЦЬ-КВЕ́ТКА



**У беларускай міфалогіі чароўная расліна, якая надавала чалавеку магічныя якасці: ён пачынаў разумець мову жывёл і дрэў, бачыць скрозь зямлю схаваныя скарбы, лячыць людзей ад розных хвароб, ведаць будучыню.**

Кветка быццам з'яўляецца ў ноч на Купалле. Паводле павер'яў, каб знайсці цудадзейную расліну ў купальскую ноч, трэба было пайсці ў лес аднаму, без факела ці без ліхтара. Насамрэч папараць ніколі не цвіце, але яе споры часам выпраменьваюць свячэнне. Гэта адносіцца толькі да рэдкай каралеўскай папараці, якой сёння на тэрыторыі Беларусі амаль не засталося — яна захавалася, у прыватнасці, у Белавежскай пушчы і занесена ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.





Папараць-кветка сустракаецца ў беларускіх казках, легендах і песнях. У сваёй творчасці да легенд, звязаных з папараць-кветкай, звярталіся Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Янка Купала («У купальскую ноч», «Курган»), Якуб Колас («Ноч, калі папараць цвіце»), Міхась Чарот («На Купалле»), Францішак Аляхновіч («Папараць-кветка»), Канстанцыя Буйло («Кветка папараці»), Уладзімір Караткевіч («У тую ноч», «Калыска чатырох чараўніц»). Вобраз чароўнай расліны выкарыстаны ў п’есе «Папараць-кветка» Івана Козела. Кампазітар Аляксей Туранкоў на лібрэта Вольгі Барысевіч, Петруся Броўкі і Пятра Глебкі ў 1940 годзе стварыў оперу «Кветка шчасця». У 1967 годзе скульптарам Анатолем Анікейчыкам створана скульптурная кампазіцыя «Папараць-кветка». У выяўленчым мастацтве папараць-кветка ўвасобілася ў карцінах Ганны Сілівончык, Галіны Крываблоцкай, цыкле фотаработ Вольгі Сяргеевай і Альберта Цэхановіча «У пошуках папараць-кветкі». Папараць-кветка з’яўляецца сімвалам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

# ПЯРУ́Н

**Бог нябеснага агню, адзін з галоўных багоў пантэона ў славянскай міфалогіі.**

У старажытных славян увасабляў навальнічную хмару, якая дае дождж і спрыяе ўрадлівасці. Пярун — старэйшы сын Сварога, служаць яму духі-памагатыя — гарцукі, здольныя ўтвараць вятры, буры, віхуры. У «Аповесці мінулых гадоў» сярод багоў Пярун названы першым. На тэрыторыі Беларусі знойдзены рэшткі свяцілішчаў-капішчаў Перуна. Паводле старажытных беларускіх павер'яў, Пярун трымаў у руках велізарныя жорны, удараў каменем аб камень і выклікаў гром і маланку. Па паданнях, Пярун знішчае злых духаў, а чалавека беражэ, таму нядобрыя духі хаваюцца ад стрэл Перуна ў чалавечым жытле, і бог спальвае яго.




Пасля пашырэння хрысціянства функцыямі і рысамі Перуна надзялілі Ілью-прарока (калі грыміць гром, беларусы кажуць: «Ілья-прарок на калясніцы едзе»), а таксама казачных герояў, якія змагаліся са змеямі і цмокамі.

Паводле ўяўленняў, Пярун — велічны, статны, высокага росту з чорнымі валасамі і доўгай залатой барадой, які раз'язджае па небе, седзячы на вогненнай калясніцы, узброены лукам і стрэламі.

Валун у Сенненскім раёне Віцебскай вобласці мае назву Пярун-камень; каля Нясвіжа адно з гарадзішчаў называецца Перунова гара, Перунова поле знаходзіцца ў Бераставіцкім раёне Гродзенскай вобласці.

Старажытныя сякеры называліся стрэламі Перуна, гром — перуном. Імя Перуна згадвалася ў праклёнах («Каб цябе пярун спаліў!»).

# ПЯСНЯ́Р

**Народны паэт, вершы якога становяцца песнямі.**

У пераносным значэнні ўжываецца ў дачыненні да таго, хто апявае, праслаўляе Радзіму і народ, з'яўляецца яго летапісцам, выразнікам яго дум і спадзяванняў.

Найчасцей беларускімі песнярамі называюць Янку Купалу, Якуба Коласа, Максіма Багдановіча. «Пясняр» — лічбавая копія рукапіснага шрыфту Янкі Купалы, якая знаходзіцца ў свабодным доступе (piasniar.by). У сучаснай публіцыстыцы вялікімі песнярамі Беларусі названы Адам Міцкевіч, Францішак Багушэвіч, Уладзімір Мулявін. «Пясняр» — спектакль, пастаўлены да 75-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Мулявіна па п'есе Васіля Дранько-Майсюка.



# СКАРБ



**Знаходкі манет, каштоўных дарагіх рэчаў, каштоўнасцей, схаваных у зямлі і іншых месцах; у пераносным значэнні — духоўныя і культурныя каштоўнасці; штосьці вялікай вартасці.**

Існуе некалькі версій паходжання слова: запазычана з лацінскай мовы, са старажытнанямецкай мовы або спрадвечна беларускае слова.

Ад слова ўтвораны словы «скарбнік» (казначэй), «скарбніца» (месца захоўвання дарагіх рэчаў, сукупнасць культурных і духоўных каштоўнасцей), «скарбовы» (які адносіцца да скарбаў), «скарбонка» (невялікая скрыначка або сумка для захоўвання грошай).

У старабеларускай мове скарбам называлі дзяржаўную казну.

Знойдзеныя ў глебе старадаўнія манеты, плацёжныя слiткі і разнастайныя ўпрыгажэнні таксама называюцца скарбамі. Пошукамі такіх рэчаў прафесійна займаюцца археолагі і нумізматы. Людзей, якія самастойна займаюцца пошукам скарбаў, называюць скарбашукальнікамі.



## ЦМОК, Смок, Чмок, Змей

**Пачвара ў выглядзе змея, дракона ў беларускай міфалогіі, казках і народных паданнях.**

Слова «цмок» агульнаславянскага паходжання, хутчэй за ўсё ўтварылася ад дзеяслова «смактаць».

У беларускіх павер'ях цмок — зборны вобраз. Пад ім разумеецца і пачварны змей, і нячысты дух, часам з чалавечымі рысамі. Цмокі згадваюцца ў Статуце Вялікага Княства Літоўскага: «Теж уставуем: зверов спракавечных стародавніх цмоков іж ніхто не мает біті альбо мучіті в неволе, як цмок той у пущех або сенажатех гуляет, або теж у болоті сідіт, або теж пріходіт до замку поесті. А хто цковал тово цмока і шкоду ему учініл, або горш тово зобівші гэтак с корыстію схоплены быв, то мает той платіті сорок рублев грошей або бітым пугою на пляцы местскім мае быть».

Вядомы фалькларыст Мікалай Нікіфароўскі адзначаў, што «цмок болей дагледжаны за іншых нячысцікаў, часта мыецца ў лазні. З-за асцярожнасці і прадбачлівасці жыве долей астатніх дэманаў. Часта чапляецца да простых вясковых людзей, але людзей сямейных не кранае. Іх расправа чакае тых, хто парушае грамадскія абавязкі».

У 2013 годзе на беразе Лепельскага возера была ўстаноўлена скульп-





тура з выявай Цмока, якая хутка набыла папулярнасць сярод турыстаў і мясцовых жыхароў. Стаў ладзіцца штогадовы фэст беларускай міфалогіі «У госці да Лепельскага Цмока».

На Лепельшчыне апісаны незвычайны вясельны абрад частавання Цмока. Быццам у Валову Гару з Лепельскага возера ў дзень вяселля абавязкова прыплываў Цмок, каб атрымаць пачастунак з вясельнага застолля. Апоўначы маладыя вылівалі самагон і кідалі закуску, адначасова прасілі ў пачвары блаславення на будучае сумеснае жыццё. Абрад частавання Цмока на вяселлі існуе ў лепельчан і сёння.

У 2006 годзе беларускі баскетбольны клуб атрымаў назву «Цмокі-Мінск».

Вобраз Цмока вельмі папулярны ў творчасці беларускіх пісьменнікаў.



# СВЯТОЧНЫЯ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ

# НАРОДНЫЯ СВЯТЫ

## НАРО́ДНЫ КАЛЯНДА́Р

**Сістэма замацаваных або рухомых дат, якая сфарміравалася ў старажытнасці і з’яўляецца арыенцірам для сельскагаспадарчых работ і рытуальных паводзін.**




Старажытны народны каляндар быў звязаны з зімовым (на Каляды) і летнім (на Купалле) сонцастаяннем.

Разам з хрысціянствам на тэрыторыі Беларусі распаўсюджваўся звыклы нам каляндар, які прыстасоўваўся да язычніцкага. Святы падзяляліся на вялікія, ці гадавыя (двунадзясятыя), і малыя, ці прысвяткі. Сучасныя беларускія назвы месяцаў — гэта адметныя словы, якія ўтварыліся падчас назіранняў за з’явамі прыроды (цвіцення дрэў і раслін — ліпень, верасень, красавік; кліматычных умоў — снежань, студзень, люты), асноўных сельскагаспадарчых работ (жнівень, кастрычнік).

Навукоўцы прыйшлі да высновы, што ў традыцыйным беларускім народным календары адлюстраваны погляды чалавека на навакольнае асяроддзе. Беларускі народны каляндар стаў аб’ектам даследавання многіх этнографаў (Іван Крук, Аксана Катовіч, Таццяна Валодзіна). Беларускія назвы месяцаў па-мастацку асэнсаваны ў вершах «Родная мова» Пімена Панчанкі, «І гавораць месяцы» Васіля Рагаўцова.



# БАТЛЕ́ЙКА

**Беларускі народны тэатр лялек.**

Батлейка атрымала распаўсюджанне ў Беларусі з XVI стагоддзя. Назва яе паходзіць ад польскага слова Betleem — назва горада Віфлеема.

Блізкія да беларускай батлейкі ўкраінскі вяртэп (найбольш пашыраны ў XVIII—XIX стагоддзях) і польская шопка (вядома з XV стагоддзя). Сцэнай для прадстаўлення батлейкі звычайна служыла двухпавярховая драўляная скрыня, дзеі пастановак адбываліся ў верхнім і ніжнім ярусах. Батлейшчыкі вадзілі драўляныя лялькі на стрыжнях па прарэзах у падлозе ярусаў. Лялек рабілі з дрэва, каляровай тканіны; валасы, вусы — з лёну ці аўчыны; вопратку шылі з тканіны. Трапляліся таксама батлейкі з лялькамі-марыянеткамі на нітках ці з пальчатачнымі лялькамі. Вядома шэсць тыпаў батлейкі. Асобнае месца займалі батлейкі, зробленыя па прынцыпе ценявога тэатра (Віцебск, Веліж), і батлейка са зменнымі празрыстымі



дэкарацыямі (Докшыцы). Падчас прадстаўлення батлеечнік знаходзіўся за скрыняй, ён не толькі рухаў лялькі, але і гаварыў тэкст за іх, часам на фоне музыкі. Паказ складаўся з дзвюх частак: кананічнай, якая паказвалася на верхнім ярусе, і свецкай, якая ігралася на ніжнім ярусе батлейкі.

У наш час батлейка перажывае адраджэнне ў форме нацыянальнага дзіцячага тэатра. Працуюць Беларускі дзяржаўны тэатр лялек (горад Мінск), Магілёўскі абласны тэатр лялек, Беларускі тэатр «Лялька» (горад Віцебск) і шматлікія іншыя дзяржаўныя і аматарскія калектывы. Рэпертуар сучаснага лялечнага тэатра (батлейкі) вельмі разнастайны, арыентаваны на дзяцей і дарослых. Спектаклі ствараюцца на аснове фальклорных сюжэтаў, народных казак, класічнай літаратуры многіх народаў, нярэдка ў новым прачытанні.

Каля Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра ў Мінску ўсталявана скульптурная кампазіцыя «Батлейка» (аўтар Леанід Зільбер).





**ВЕ́РБНІЦА**, Вербіч, Вярба, Вербная нядзеля

**Хрысціянскае свята, звязанае з уваходам Ісуса Хрыста ў Ерусалім, якое адзначаецца ў апошнюю нядзелю перад Вялікаднем.**

Па даўняй традыцыі радасны і ўсхваляваны народ рассцілаў дарогу Ісусу маладымі пальмавымі галінкамі. Сімвалам пальмавых галінак на тэрыторыі Беларусі сталі галінкі вярбы, адсюль і народная назва свята. Здаўна ў гэты дзень у храмах асвячаюць галінкі вярбы, якія потым нясуць дадому і выкарыстоўваюць як абярэг жытла і гаспадаркі. Прыгаворваючы «Верба свята — нова лята, верба пасвіці ў поле гнала» галінкай асвячонай вярбы выганялі жывёлу на першы выпас.

## ВЯЛІ́КДЗЕНЬ, Вялікадне, Вялікаднік, Вялічка, Пасха

**Хрысціянскае свята ў гонар уваскрэсення Ісуса Хрыста; галоўнае веснавое свята ў традыцыйным беларускім народным календары.**

У святкаванні Вялікадня на тэрыторыі Беларусі перапляліся хрысціянскія і дахрысціянскія ўяўленні. Некаторыя мясцовыя формы падрыхтоўкі да свята і яго правядзення маюць статус нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі (распісванне яек і выраб «пальмы» на Вербніцу ў гарадскім пасёлку Сапоцкіне Гродзенскага раёна; хрэсны ход у вёсцы Аброва Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці).

У шэрагу раёнаў Беларусі Вялікдзень з'яўляўся памінальным днём. Людзі ішлі на могілкі і качалі на магілах велікодныя яйкі.

Да Вялікадня варылі, пяклі, смажылі розныя стравы: булкі, пірагі, каўбасы, сала, фарбавалі і варылі яйкі. Рытуальнай стравай з'яўлялася чырвонае яйка, асвячонае ў царкве ці касцёле. Асвячоныя на Вялікдзень хлеб,







соль, як і косткі ад велікоднага стала, шалупінне ад яек ці самі велікодныя яйкі, выкарыстоўваліся ў земляробчай працы. Косткі ад велікоднага застолля збіралі і закопвалі на ніве, каб пасевы не пацярпелі ад граду. Скарынкі хлеба выкарыстоўвалі пры першым выхадзе на сяўбу збожжавых, пры выгане скаціны ў поле. Адной з асаблівасцей святкавання беларускага Вялікадня з'яўляецца хаджэнне валачобнікаў у ноч з першага на другі дзень.

Самая любімая гульня на Вялікдзень — біткі, калі гульцы стукаюцца фарбаванымі яйкамі і пераможцам аказваецца той, у каго яно застаецца цэлае («мацак»).

Беларускае вітанне на Вялікдзень: «Хрыстос уваскрос! — Сапраўды ўваскрос!»

# ГУКА́ННЕ ВЯСНЫ́



**Старажытнае свята развітання з зімой і сустрэчы вясны.**

Свята мае язычніцкае паходжанне. Суправаджаецца абрадавымі веснавымі песнямі, карагодамі. Дакладнай даты святкавання не мае (у канцы сакавіка — пачатку красавіка). Найчасцей падчас свята збіраліся на адкрытым месцы (горцы, беразе ракі, краі лесу). Месца святкавання ўпрыгожвалася рознакаляровымі стужкамі, яркімі птушкамі, выразанымі з кардону, паперы, тканіны; складалася вогнішча і вакол яго спяваліся песні-вяснянкі. Ключавая фігура гэтага свята — бусел. Асаблівай увагай карысталіся птушкі, выпечаныя з цеста. Найчасцей пяклі сорак кавалкаў печыва ў выглядзе птушак і раздавалі дзецям. У некаторых рэгіёнах іх называюць «буські» або «буськавы лапы». Такіх птушак, зробленых з хлеба, звычайна раскладвалі ў наваколлі, каб яны прыцягвалі птушак, якія, па павер'ях, на сваіх крылах нясуць вясну.



# ДАЖЫ́НКІ

**Святкаванне заканчэння жніва.**

Паводле Яўхіма Карскага, першыя згадкі пра свята сустракаюцца ў хроніках пад XII стагоддзем. Хаця сама традыцыя можа весці свой пачатак яшчэ ад неаліту, калі на тэрыторыі Беларусі з'явілася земляробства. У многіх вёсках захаваўся абрад «Завіванне барады». Пасля збору ўраджаю было прынята пакідаць на полі некалькі нязжатых каласкоў. Іх абвязвалі поясам — «завівалі бараду». Побач з імі клалі хлеб з соллю, яйкі. Апошнія каласкі называліся ў розных мясцовасцях Дзедавай Барадой, Богавай Барадой. Або казалі, што пакідаюць каласкі «казе на бараду». Побач рассцілалі чыстае палатно, на якое клалі кавалачак хлеба і соль.

З 1996 года дажынкі праводзяцца як Рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі. На фестывалі ўзнагароджваюць найлепшых працаўнікоў аграпрамысловага комплексу. Афіцыйную частку звычайна пачынае шэсце ганаровых гасцей, дэлегацый абласцей, творчых калектываў. Эмблемай фестывалю з'яўляецца сцяг з выявай залатога калосся. Звычайна свята працягваецца два дні: у першы — урачыстая частка і выступленне фальклорных калектываў, у другі — кірмаш і канцэрты.



# ДЗЯДЫ́



**Людзі, якія жылі раней, продкі; старажытны абрад памінання нябожчыкаў, а таксама дзень, калі адбываўся гэты абрад.**

Адзначаліся калядныя Дзяды (перад Калядамі), масляныя (перад Масленіцай), піліпаўскія (перад калядным постам), радаўніцкія (перад Радаўніцай), траецкія (перад Тройцай). Спецыфіка гэтага абраду выяўляецца ў семантыцы беларускага фразеалагізма «(нагатаваць) ежы як на Дзяды» — шмат ежы, бо па традыцыі на Дзяды накрывалі багаты стол. У гэтым бачыцца моцны культ продкаў у нацыянальнай свядомасці беларусаў.

У 2013 годзе на сцэне Рэспубліканскага Палаца культуры прафсаюзаў пастаўлены спектакль па паэме Адама Міцкевіча «Дзяды».



## КАЛЯ́ДЫ, калядныя святкі, калядныя нядзелі

**Народнае зімовае свята дахрысціянскага паходжання.**

Слова ўтворана ад лацінскага слова Calendae (календы) — назва першага дня кожнага месяца ў рымлян. Святкаванне Каляд было звязана з народным абрадам сустрэчы Новага года. У гадавым коле народных земляробчых абрадаў і свят Каляды займалі найважнейшае месца. З распаўсюджваннем хрысціянства свята было прымеркавана да рэлігійных свят Нараджэння Хрыстова і Хрышчэння Гасподняга, таму хрысціянская абраднасць святкавання Каляд шчыльна пераплецена з народнымі звычаямі. У гэтыя дні ладзіліся калядаванне, варажба, шматлікія забавы, гульні, спяваліся калядныя песні. Увечары сяляне-калядоўшчыкі пераапраналіся ў жывёл (казу, тура, бусла, зайца), дзіўных чароўных істот (дзеда, бабу, цыгана, чорта) і хадзілі па вёсцы. Яны спыняліся ля кожнага двара, і кожны гаспадар павінен быў запрасіць іх у хату, інакш на будучы год шчасця і дабрабыту не будзе. Калядоўшчыкі спявалі, танцавалі, ігралі на дудзе і бубне, ладзілі імправізаваныя сцэнкі. У канцы выступлення яны ў форме песні ці вершаванага звароту жадалі гаспадарам багацця, здароўя, сямейнага дабрабыту.

Каляды — адно з самых любімых свят беларусаў, што адлюстравалася ў прыказцы: «Калядкі — добрыя святкі: пад’еў ды на палаткі».



# КУПА́ЛЛЕ

**Старажытнае язычніцкае свята летняга сонцастаяння ва ўсходніх славян, якое святкуецца ў ноч з 6 на 7 ліпеня па новым стылі (з 23 на 24 чэрвеня па старым стылі). З прыходам хрысціянства да свята прымеркаваны дзень Іаана Хрысціцеля.**

У беларусаў існуе павер'е, што на Купалле раскрываецца ўся прырода. Купальскі культ — гэта не толькі пакланенне сонцу, але і ўшанаванне раслін, якія ў купальскую ноч, згодна з павер'ямі, валодаюць асаблівай сілай, здольныя быць і лекавымі, і атрутнымі. Цэнтральная расліна свята — папараць-кветка, якая, паводле беларускай легенды, цвіце толькі ў гэту ноч. Беларусы адзначаюць свята і сёння, захоўваючы традыцыі (пераскокванне маладых пар праз вогнішча, гульні, танцы). Звычайна ладзіцца на прыродзе, каля вадаёмаў. У сучаснай беларускай культуры свята адзначаецца на розных узроўнях — ад рэспубліканскага да мясцовага.





Самае маштабнае ў Беларусі свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»), якое праходзіць у Шклоўскім раёне Магілёўскай вобласці. За некалькі гадоў яно стала сапраўдным брэндам краіны: сюды прыязджаюць шматлікія госці не толькі з Беларусі, але і з Расіі, Украіны, іншых краін свету. Свята «Купалле» ў аграгарадку Александрыя бярэ свой пачатак з 2011 года. Усе купальскія мерапрыемствы праходзяць на беразе ракі Днепр. У аснову свята пакладзена ідэя паказу развіцця купальскіх традыцый у сусветнай прасторы і часе, а таксама культурны абмен паміж рознымі дзяржавамі ў галіне нацыянальнай самабытнасці. Дзякуючы гэтаму геаграфія свята пастаянна пашыраецца.

## **МА́СЛЕНІЦА**, Сырны тыдзень, Масленка

**Зімова-вясенні тыдзень перад пачаткам Вялікага посту.**

У народным календары няма канкрэтнай даты свята, яно пачынаецца роўна за восем тыдняў да Вялікадня. Працягваецца тыдзень. Свята раней было напоўнена святочнымі абрадавымі дзеяннямі, частаваннем, гульнямі і забавамі. Яго назва сведчыць аб перавазе малочных страў у гэты перыяд. Абрадавымі стравамі тыдня былі масла, тварог і сыр. Штодзень частаваліся таксама блінамі без мяса, бо паводле хрысціянскага звычаю тыдзень называўся «мясапусным».

Святкаванне Масленіцы мела некалькі сэнсаў: провады зімы, жаданне хуткага прыходу вясны і ўмацаванне сямейных і міжсуседскіх сувязей. Усе абрадавыя дзеянні былі накіраваны на забеспячэнне багатага ўраджаю і дабрабыту. Гэта прасочваецца ў кожным дні масленічнага





тыдня. У панядзелак — «Сустрэча» — адкрыццё кірмашоў, падрыхтоўка месцаў гулянняў. Робіцца пудзіла Масленіцы. З аўторка («Заігрыша») пачынаюць хадзіць адзін да аднаго ў госці і катаюцца з горак. Незамужнія дзяўчаты варожаць. Серада мае назву «Ласуха», чацвер — «Шырокі чацвярток», «Крывы» або «Тлусты». У гэты дзень пачынаюцца гулянні. У пятніцу («Цешчыны адвячоркі») і суботу («Залоўкіны вячоркі») прынята хадзіць у госці да родзічаў. У нядзелю («Провады») пудзіла Масленіцы возяць па вёсцы і спальваюць на вялікім вогнішчы. У гэты дзень прынята папрасіць прабачэння адзін у аднаго («Даравальная, або «Прашчоная» нядзеля»). Масленіца — адно з любімых і шанаваных свят беларусаў, што адлюстравалася ў народных песнях:

А чаму ж Масленкі не сем нядзель,
а нашай Масленкі сем дзяньков.

У беларусаў існуе прыказка «Мінулася кату масленіца».

**РА́ДАЎНІЦА**, Раданіца, Радуніца, Радаўніцкія Дзяды, «Вялікдзень мёртвых»

**Дзень памінання памерлых ва ўсходніх славян.**

Бярэ вытокі з язычніцтва, звязана з культам продкаў, хрысціянская царква прымеркавала свята да Вялікадня (адзначаецца на дзяўяты дзень пасля яго).

Па адной з версій, у аснове назвы свята ляжыць слова «радасць», аднак ёсць думка, што паняцце пайшло ад слова «род». Лінгвісты праводзяць паралелі з літоўскім словам «rauda» — плач з галашэннем. У беларусаў даўні звычай памінання продкаў атрымаў надзвычайную трываласць, асаблівае развіццё, шматстайнасць, рэгіянальныя асаблівасці.

Звычайна беларусы раніцай ішлі памінаць блізкіх у царкву, а потым на могілкі, дзе прыводзілі ў парадак магілы блізкіх і спраўлялі памінальную трапезу. Заканчвалася Радаўніца застоллем дома, таму ў беларускай мове ўзнікла прымаўка «На Радаўніцу да абеду пашуць, па абедзе плачуць, а ўвечары скачуць».

Толькі ў Беларусі гэты дзень з’яўляецца дзяржаўным выхадным.



# БЕЛАРУСКІЯ СТРАВЫ

## НАЦЫЯНА́ЛЬНАЯ КУ́ХНЯ

**Набор страў і напояў, прыгатаваных па традыцыйных рэцэптах.**

Беларуская кухня фарміравалася пад уплывам земляробства і шырокага выкарыстання мясцовых прадуктаў, а таксама пад уздзеяннем суседніх народаў і перасяленцаў. Таму сучасная беларуская кухня падобная да літоўскай, украінскай, польскай, яўрэйскай і рускай.

Адметнай рысай беларускай кухні з'яўляецца шырокае распаўсюджанне страў з бульбы, а таксама выкарыстанне разнастайных каўбас, круп, грыбоў, свініны. Беларуская кухня адрозніваецца дастаткова складанай і доўгай апрацоўкай прадуктаў. Гэта тушэнне, тамленне, запяканне, варка, смажанне. Асаблівае месца ў беларускай кухні займае свініна. У вёсках да гэтага часу захавалася традыцыя ў пачатку зімы калоць свінню і рабіць каўбасы, засольваць сала і выраблять паляндвіцу — падсушанае салёнае мяса. Гонар нацыянальнай кухні — беларускі хлеб. Ён





выпякаецца з жытняй мукі часцей за ўсё без дражджэй, на асаблівай заквасцы. Хлеб атрымліваецца цяжкім, з прыемнай кіслінкай у смаку. У спрадвечна беларускіх рэцэптах выкарыстоўваліся прыправы і дабаўкі: кмен, каляндра, кроп, семкі. Згодна з традыцыяй хлеб выпякалі на «падушцы» з лістоў бярозы, клёна, дуба.

Магнаты і шляхта вылучаліся асаблівай вынаходлівасцю і вытанчаным кулінарным густам. Іх стравы адрозніваліся разнастайнасцю экзатычных прадуктаў і спецый і вельмі складанай рэцэптурай. Былі распаўсюджаны разнастайныя напіткі (гарэлка, крупнік) і стравы (дранікі, верашчака, свініна, тушаная ў збанках са смятанай і грыбамі, юшка са шчупака, бульбяныя клёцкі са шкваркамі, бліны з мачанкай, клёцкі «з душамі».





**БА́БКА**, таркаванка, агульнік, дзед, дранка, маўчун, бульбяная каша

**Традыцыйная беларуская народная страва ў выглядзе запечанай таркаванай бульбы, засквaранай салам, мясам, цыбуляй, спецыямі.**

Гатовую бабку падаюць з малаком або смятанай. Страва вядома на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Папулярная таксама ў літоўскай кухні пад назвай «кугеліс». Мяркуецца, што ў беларусаў, літоўцаў і ўкраінцаў яна з’явілася ў канцы XIX стагоддзя. Паходжанне назвы звязваюць з іранічным пераносам польскай назвы babka — традыцыйная святочная выпечка з цукатамі, разынкамі, арэхамі, прапітаная ромам і пасыпаная цукровай пудрай, у той час як беларуская бабка — з бульбы і сала.



## БЛІН

**Плоскі і круглы мучны выраб, прыгатаваны з вадкага цеста метадам смажання на патэльні.**

Бліны гатуюцца з розных відаў мукі (пшанічная, жытняя, аўсяная) на аснове рошчыны (кіслыя) ці на содзе (прэсныя), з даданнем яек, цукру. Могуць падавацца з мачанкай, малаком, смятанай. З пшанічнай мукі пякуць невялікія тоўстыя бліны — аладкі і тонкія — налісннікі. У беларускай народнай культуры прыгатаванне бліноў уваходзіць у шэраг абрадавых дзеянняў (напрыклад, памінальнага характару, блінамі маглі карміць жывёлу пры першым выгане на пашу), пры святкаванні многіх свят. На Каляды гаспадар клікаў калядоўшчыкаў з блінам у руцэ, бліны выкарыстоўваліся падчас варажбы на замужжа. У круглай форме бліна бачыцца ўвасабленне сонца, чым можна патлумачыць спажыванне бліноў на Масленіцу. Існуе своеасаблівая традыцыя беларускага маўленчага этыкету: калі госць заходзіць у хату, дзе гаспадыня выпякае бліны, ён кажа: «Скачком бліны!», на што чуе адказ гаспадыні: «Тарчком з ізбы!» Гэта можа патлумачыць народную прымету, згодна з якой пры выпяканні бліноў непажадана прысутнасць чужых людзей.

Вядома прыказка «Першы блін камяком», якая абазначае, што першыя крокі ў новай справе не заўсёды бываюць удалымі.





# БУ́ЛЬБА

**Аднагадовая агародная расліна сямейства паслёнавых, а таксама клубні гэтай расліны, якія выкарыстоўваюцца як харчовы прадукт, корм і сыравіна; назва беларускага народнага танца.**

Практыцы вырошчвання бульбы на землях Беларусі некалькі стагоддзяў, аднак папулярнасць гэтай расліны відавочная, што прасочваецца ў наяўнасці крылатых выразаў («Бульба — другі хлеб»), мностве страў з бульбы (дранікі, клёцкі, камы, калдуны, бабка — многія з гэтых слоў не маюць адпаведнікаў у іншых мовах, як, напрыклад, словы «бульбянішча» — месца, дзе расце бульба, «бульбоўнік» — сцёблы бульбы). Бульба стала адным з галоўных прадуктаў харчавання беларусаў і выцесніла многія іншыя сельскагаспадарчыя культуры ўжо ў другой палове XIX стагоддзя.





У гарадах з'яўляюцца папулярнымі сталовыя, закусачныя, у меню якіх пераважаюць стравы з бульбы пад назвай «Бульбяная».

Многія беларусы вырошчваюць бульбу на ўласных лецішчах. Засведчана бульба і ў шматлікіх творах беларускіх пісьменнікаў («Капаюць бульбу землякі» Сяргея Законнікава, «Бульба» Пімена Панчанкі, «Чышчу бульбу», «Паляць бульбоўнік», «Бульбяная балада» Рыгора Барадуліна). У апошнім творы паэт адзначае:



Бульба з намі ідзе вякамі,
бульба тоўчаная, цалкамі,
бульба параная, бульба вараная,
і нішчымная, і заскваранаяя.

Даволі распаўсюджаны ў беларускім маўленні выклічнікавы фразеалагізм «хавайся ў бульбу» як выказванне перасцярогі.



## ВЕРАШЧА́КА

**Традыцыйная беларуская, польская і літоўская страва.**

Вядома з сярэдзіны XVIII стагоддзя. Мае разнастайныя варыянты прыгатавання: падсмажаныя кавалачкі сала, каўбасы з вострымі прыправамі і мукой, тушаныя ў печы, густы суп з кілбасой і ячнай кашай.

Захаваліся звесткі, што ў Варшаве пры двары Аўгуста III быў славуты кухмістр па мянушцы Верашчака, які падаваў да стала нарэзаную каўбасу, перакладзеную салам і палітую вострым соусам.

# ДРА́НІКІ

**Бліны з таркаванай бульбы, вельмі распаўсюджаная страва ў беларусаў.**

Дранікі — адна з самых папулярных беларускіх нацыянальных страў. Але ў традыцыйнай беларускай кухні з'явіліся яны толькі ў XIX стагоддзі дзякуючы ўплыву яўрэйскай і нямецкай кухань. Першы вядомы ў Беларусі рэцэпт дранікаў быў знойдзены ў кнізе Яна Шытлера «Кухар добра навучаны» (1830 год).

Дранікі гатуюць з таркаванай сырой бульбы, у цеста дадаюць муку, яйкі, таксама могуць дадавацца цыбуля, морква, смятана. Часта робяць дранікі з начынкай: з мясам, грыбамі, варанымі яйкамі. Дранікі смажацца на алеі ці тлушчы, пасля чаго адразу падаюцца на стол. Часам ужо гатовыя дранікі запякаюць у гаршку з салам, смятанай, цыбуляй, грыбамі.

Папулярнасць дранікаў у сучаснай беларускай культуры выяўляецца ў фестывалі «Дранік-фэст», што ладзіцца штогод у горадзе Магілёве.



# МАЧА́НКА

**Папулярная страва беларускай нацыянальнай кухні.**

Назва паходзіць ад слова «макаць», бо звычайна мачанка ўжываецца не як самастойная страва, а для макання ў яе варанай гародніны, бліноў, дранікаў. Найбольш распаўсюджана яна са свініны, сала, часам з хатняй каўбасы, шкварак, запраўленых соусам з мукі і вады. У мачанку можна дадаваць вараную бульбу, цыбулю, кроп, малады кмен. Вельмі сытная, з незабыўным смакам і нацыянальным каларытам. Яна бывае і малочная, гатуецца з тварагу, малака і вяршкоў. У залежнасці ад узятых прапорцый малочная мачанка можа быць густой ці больш вадкай, кіслай або салодкай.







# ХЛЕБ

**Прадукт харчавання, які выпякаецца з мукі; у пераносным значэнні — сродкі існавання, заробак.**

Слова «хлеб» часта выступала сінонімам паняццю «ежа»: «Хто ў неба глядзіць, той без хлеба сядзіць», «Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы», «Пайшоў на свой хлеб». Традыцыйна існавалі два віды хлеба: чорны і белы. Жыта было асноўнай сельскагаспадарчай культурай на тэрыторыі Беларусі, таму чорны хлеб быў штодзённай сялянскай ежай. Пшаніца расла кепска, сеялі яе мала, таму белую муку выкарыстоўвалі на велікодныя булкі і вясельныя караваі.

Хлеб мае моцнае сімвалічнае значэнне. Ён выкарыстоўваўся ў шматлікіх сямейных і каляндарных абрадах, выступаў увасабленнем багацця, спрыяння, дабрабыту. У фальклорных творах сустракаецца выраз «доля хлебавая». Пра хлеб казалі, што гэта «дар Божы», да якога патрабавалася адпаведнае стаўленне. Такія адносіны адлюстраваліся ў шматлікіх беларускіх прыказках і прымаўках: «Хлеб — усяму галава», «Той добры край, дзе хлеба акрай», «Без хлеба няма абеда і худая бяседа», «Хлеб





еш ды й другому не шкадуй», «Пірага шукаеш, а хлеба не цурайся», «Хто хлеб з сабою нясе, той есці не просіць», «Як не стала хлеба, дык і нож не трэба».

Вялікім грахом лічылася раскідаць крошкі хлеба, гэта пагражала неўраджаем.

У маўленні беларусаў слова «хлеб» ужываецца часта: «Хлеб ды соль» — прыемнага, добрага апетыту (пажаданне таму, каго засталі за ядой); зайцаў хлеб — рэшткі яды, прывезеныя з поля, лесу дзецям. Хлеб выкарыстоўваўся на ўсіх этапах вясельнай абраднасці (сватанне, запоіны, заручыны, гулянкі ў хатах маладой і маладога, паслявясельныя дні).

Ёсць паданне, што хлеб, спечаны з мукі, змолатай на вадзяным млыне на Купалле, не даваў чалавеку патануць на працягу года. На дзень святога Юр'я хлебам абносілі статак, каб каровы пладзіліся і не гінулі ад ваўкоў. У гэты ж дзень гаспадар з хлебам абыходзіў свае палеткі.

# ЗМЕСТ


Прадмова .......... 3

ТРАДЫЦЫЙНЫ ПОБЫТ БЕЛАРУСАЎ .......... 5

ПАСЕЛІШЧЫ І ПАБУДОВЫ .......... 6

Вёска .......... 6
Гарадзішча .......... 8
Гасцінец .......... 10
Дарога .......... 11
Замчышча .......... 12
Кірмаш .......... 13
Мястэчка .......... 15
Ратуша .......... 16
Хата .......... 18
Хутар .......... 20

ВАКОЛ ХАТЫ .......... 21

Буслянка .......... 21
Дамавік .......... 22
Дрэва .......... 24
Жорны .......... 24
Калодзеж .......... 26
Лазня .......... 27
Млын .......... 28

У ХАЦЕ .......... 30

Гасціннасць .......... 30
Жалейка .......... 32
Калыханка .......... 33
Каханне .......... 34
Кросны .......... 35
Культ продкаў .......... 36
Куфар .......... 37
Лялька .......... 38
Парог .......... 39
Печ .......... 40
Ручнік .......... 41
Спадар .......... 43
Сям'я .......... 44
Талака .......... 45

ХАТНЯЯ І СВОЙСКАЯ ЖЫВЁЛА .......... 46

Карова .......... 46
Конь .......... 47
Кот .......... 49
Курыца .......... 50
Певень .......... 51
Пчала .......... 52
Сабака .......... 53
Свіння .......... 54

АДЗЕННЕ .......... 55

Беларускі нацыянальны касцюм .......... 55
Андарак .......... 57
Арнамент .......... 58
Брыль .......... 60
Вышыванка .......... 61
Вянок .......... 63
Лапці .......... 65

СВЕТ БЕЛАРУСКАЙ ПРЫРОДЫ .......... 67

БЕЛАРУСКІЯ ЛАНДШАФТЫ .......... 68

Балота .......... 68
Валун .......... 70
Возера .......... 72
Крыніца .......... 74
Лес .......... 75

РАСЛІНЫ ..... 77
Бяроза ..... 77
Васілёк ..... 78
Вішня ..... 80
Вярба ..... 81
Дуб ..... 82
Журавіны ..... 84
Жыта ..... 86
Канюшына ..... 88
Лён ..... 89
Шыпшына ..... 90

ЖЫВЁЛЫ ..... 91
Бусел ..... 91
Воўк ..... 93
Жаба ..... 94
Змяя ..... 95
Зубр ..... 96
Зязюля ..... 98
Мядзведзь ..... 99

МАТЧЫНА МОВА ..... 101
МОЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ..... 102
Аканне ..... 102
Апостраф ..... 103
Дзеканне ..... 104
Кірыліца ..... 105
Кітабы ..... 106
Клічны склон ..... 108
Лацінка ..... 109
Літара «Ў» ..... 111

МАЎЛЕНЧЫ ЭТЫКЕТ ..... 113
«Бывайце здаровы» ..... 113
Бяседа ..... 115
Дзякуй ..... 116
Жарт ..... 117
Імя ..... 118
Калі ласка! ..... 120
Маўленчы этыкет ..... 121
Прозвішча ..... 123
Прыказка ..... 124
Прымаўка ..... 125
Прыпеўка ..... 126
Фальклор ..... 127

З СІВЫХ ЛЕГЕНД ..... 129
Асілак ..... 129
Барысавы камяні ..... 130
Валатоўка ..... 131
Вясёлка ..... 132
Колер ..... 133
Крыж ..... 136
Курган ..... 138
Млечны Шлях ..... 140
Несцерка ..... 141
Папараць-кветка ..... 142
Пярун ..... 144
Пясняр ..... 145
Скарб ..... 146
Цмок ..... 147

СВЯТОЧНЫЯ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ ..... 149
НАРОДНЫЯ СВЯТЫ ..... 150
Народны каляндар ..... 150
Батлейка ..... 151
Вербніца ..... 153
Вялікдзень ..... 154
Гуканне вясны ..... 156
Дажынкі ..... 157
Дзяды ..... 158
Каляды ..... 159
Купалле ..... 160
Масленіца ..... 162
Радаўніца ..... 164

БЕЛАРУСКІЯ СТРАВЫ ..... 165
Нацыянальная кухня ..... 165
Бабка ..... 167
Блін ..... 168
Бульба ..... 170
Верашчака ..... 172
Дранікі ..... 173
Мачанка ..... 174
Хлеб ..... 176

Навукова-папулярнае выданне

# ВЯЛІКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ МАЛЕНЬКАГА ПРАФЕСАРА

## Традыцыйная культура і побыт беларусаў

Рэдактар А.І. Левіціна

Мастацкае афармленне і камп'ютарная вёрстка: А.А. Левіцін

Карэктар В.Г. Багуцкі

6+

Падпісана да друку 22.07.2021. Фармат 70 × 90 1/16.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 13,13. Ул.-выд. арк. 13,74.
Тыраж 1500 экз. Заказ 1181.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/1 ад 08.07.2013.
Зав. Калініна, 16, 220012, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/102 ад 01.04.2014.
Пр-т Незалежнасці, 79/1, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.

ISBN 978-985-11-1304-6
9 789851 113046

ВЯЛІКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ
МАЛЕНЬКАГА ПРАФЕСАРА

традыцыйная культура і побыт беларусаў